Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

№181 (28545)

20 ВЕРАСНЯ 2017 г. СЕРАДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

стар. 5–12

Прыкметы паспяховага аграгарадка

МС

З таленавітага школьніка — у бізнесмены

СТАР. 4

Сакрэт дэмаграфічнага «выбуху» ў Лагойску

СТАР. 13

«Каралеўская» гаспадарка



Гаспадар аграсядзібы «Бярозкі», якая месціцца ў вёсцы з гэткай жа назвай у Сенненскім раёне, Сяргей ПАГАРЭЛЬСКІ ў вольны ад работы час (а ён працуе егерам у мясцовым таварыстве паляўнічых і рыбаловаў) захапляецца экзатычнымі птушкамі — фазанамі. Амаль паўтара дзясятка прыгожых і дагледжаных птушак гадуюцца ў руплівага гаспадара. Тут і зялёны румынскі фазан, і звычайны паляўнічы фазан і — асабліва — кітайскі сярэбраны фазан.

— Захапленне фазанамі прыносіць мне душэўную асалоду. Ды і наведвальнікам аграсядзібы таксама падабаецца назіраць за каралеўскімі птушкамі, — гаворыць Сяргей Пагарэльскі.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

ЛІЧБА ДНЯ

$267 млн

асабістых пераводаў з-за мяжы атрымалі беларусы ў другім квартале 2017 года, што на 22,5% больш у параўнанні з аналагічным перыядам 2016 года, паведамілі ў Нацыянальным банку. Чыстая аплата працы (мінус выплачаныя падаходныя падаткі) склала $96,6 млн, павялічыўшыся ў параўнанні з другім кварталам 2016 года на 19,7%. Грашовыя пераводы работнікаў склалі $143,4 млн, што на 23% больш. За мяжу ў другім квартале беларусы адправілі $27,4 млн асабістых пераводаў, або на 1,5% больш.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.09.2017 г.

Долар ЗША	1,9405	▲
Еўра	2,3262	▲
Рас. руб.	0,0333	▼
Укр. грыўня	0,0742	▲

ISSN 1990 - 763X

■ Ва ўрадзе

Эканоміка будзе працаваць у цяпле

На пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў разгледзелі пытанні гатоўнасці да работы ў асенне-зімовы перыяд. Паводле слоў прэм'ер-міністра Андрэя Кабякова, сёлета па гэтым кірунку ў краіне дасягнулі крыху лепшых вынікаў, чым за аналагічны перыяд летась.

«Напрыклад, на 14 верасня пашпарты гатоўнасці атрымалі 80,2% спажыўцоў, год таму іх было 71,2%. Гатоўнасць цеплакрыніц складае 76,5%. На аналагічную дату летась паказчык быў на ўзроўні 62,5%», — растлумачыў прэм'ер-міністр. Разам з тым каторы год у краіне не могуць завяршыць мадэрнізацыю кацельняў, якія маюць павышаны расход паліва і электраэнергіі. У пачатку года іх налічвалася 14. Гэтую работу плануецца завяршыць сёлета, акрамя адной кацельні ў Магілёўскай вобласці.

Сярод іншых праблемных пытанняў, паднятых прэм'ер-міністрам на пасяджэнні, быў і перарасход цеплавой энергіі на яе транспарціроўку ў цеплавых сетках па асобных раёнах у жыллёва-камунальнай гаспадарцы. «Пры норме 12% у другім квартале 2017 года ў Ляхавіцкай ЖКГ Брэсцкай вобласці страты цеплаэнергіі склалі 23,1%, у Дрыбінскай ЖКГ Магілёўскай вобласці — 21,4%, Коханаўскай ЖКГ Віцебскай вобласці і Свіслацкай ЖКГ Гродзенскай вобласці — па 20,3%. Хацелася б пачуць ад кампетэнтных службовых асоб, калі мы разбяромся з гэтым», — удакладніў ён.

Таксама Андрэй Кабякоў закрануў тэмы спраўнасці прыбораў уліку сістэмы рэгулявання аціплення і гарачага водазабеспячэння, расчысткі прасек паветраных ліній электраперадачы і прылеглага да іх лесу ад небяспечных дрэў і насаджэнняў, а таксама запазычанасці за тарфяное і драўнянае паліва.

Падчас пасяджэння першы намеснік міністра эканомікі Дзмітрый Крутой адзначыў, што па выніках аналізу інфармацыі аб праведзенай рабоце можна казаць пра тое, што мерапрыемствы па падрыхтоўцы да асенне-зімовага перыяду выконваюцца ва ўстаноўленыя тэрміны. Акрамя таго, ён паведаміў, што ў краіне на 14 верасня створаны запасы паліва ў наступных аб'ёмах: паліўны мазут — 395 тыс. т пры заданні 385 тыс. т (тэмп росту 102,4% да задання на 1 кастрычніка), аб'ём запасаў драўнянага паліва на складах арганізацый Мінлясгаса — 635 тыс. куб. м пры заданні 616 тыс. куб. м (103,2% да задання). Арганізацыямі жыллёва-камунальнай гаспадаркі нарыхтавана больш за 1,6 млн куб. м драўнянага паліва, або 90% да задання на 1 кастрычніка. Паводле яго слоў, у гэтым кірунку за два тыдні трэба будзе нарыхтаваць 182 тыс. куб. м. Па інфармацыі Мінжылкамунгаса і Мінлясгаса, праблем з гэтым быць не павінна.

Ілья КРЫЖЭВІЧ. *Kryzhevich@zviazda.by*

■ Нашы дзеці

ЦІ ЎСІМ БЫЦЬ ВУНДЭРКІНДАМІ?

Сучасныя малыя ведаюць алфавіт, але не ўмеюць гуляць

Не здзіўляйцеся, але афрыканцы да двух гадоў інтэлектуальна лепш развітыя, чым іх равеснікі ў еўрапейскіх краінах. Гэта тлумачыцца тым, што на гарачым кантыненце мамы, як правіла, паўсюдна носяць малых пры сабе, і немаўляты пастаянна ўспрымаюць наваколле, што дапамагае ім хутка развівацца. Пасля маленькія еўрапейцы абганяюць афрыканцаў у развіцці, бо пачынаюць адукоўвацца. Такі цікавы факт паказалі даследаванні вучоных. Здаецца, гэта павінна стымуляваць сучасных бацькоў пачынаць развіваць немаўлят ледзьве не з пялюшак, і чым большая нагрузка — тым лепш. Але не ўсё так проста. У раннім узросце (ад паўгода да трох) з дзецьмі трэба займацца толькі тым, што яны здольны ўспрыняць і зразумець, інакш атрымаецца не развіццё, а дрэсіроўка, якая праз гады нічым добрым не адгукнецца.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ ЛЯДОЎНЮ АБО ВЯНДЛЯРНЮ

Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал 2017 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

БЕЗ ЛІШНЯГА КОНТРОЛЮ НАД БІЗНЕСАМ

У Палацы Незалежнасці абмяркоўваецца пакет дакументаў па стымуляванні дзелавой актыўнасці

Учора кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка прысвяціў дзве рабочыя сустрэчы развіццю прадпрымальніцтва. Нагадаем, на мінулым тыдні Прэзідэнт ужо займаўся гэтай тэматыкай.

Акуратная прыватызацыя і самарэгуляванне

З міністрам эканомікі Уладзімірам Зіноўскім кіраўнік краіны абмеркаваў тры праекты ўказаў Прэзідэнта. Першы датычыўся ўдасканалення рамесніцтва, другі — рэгулявання адносін у сферы аграэкатурызму, трэці быў прысвечаны ўмацаванню механізмаў самарэгулявання бізнесу.

Гаворачы пра пашырэнне відаў рамесніцкай дзейнасці і ўвогуле пра гэты дакумент, кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на наступны нюанс. Так, для таго каб забяспечыць рамеснікаў памяшканнямі для заняткаў гэтай дзейнасцю, прадугледжваецца магчымасць перадачы ім невыкарыстоўваемай маёмасці, што знаходзіцца ў рэспубліканскай або камунальнай уласнасці. Памяшканні прапануецца перадаваць у бязвыплатнае карыстанне, а па праходжанні трох гадоў магчымы продаж памяшкання рамесніку па цане, роўнай адной базавай велічыні.

— Мяне асабліва насцярожвае, калі вы вось так свабодна імкняцеся за нейкую адну базавую велічыню дзяржаўную ўласнасць некаму перадаць — нібыта ў нас ёсць праблемы з прыняццем падобных рашэнняў, — прызнаўся кіраўнік дзяржавы. — Думаю, нам нельга разбазарваць дзяржаўную ўласнасць. Трэба вельмі акуратна ставіцца да прыватызацыі — гэта фактычна прыватызацыя — дзяржаўнай уласнасці. І нельга яе дзяліць на дарагую, танную, вялікую, малую — гэта створана народам, і тут нам трэба быць вельмі акуратнымі і асцярожнымі.

Другі нарматыўна-прававы акт, які разглядаўся падчас рабочай сустрэчы, — развіццё аграэкатурызму.

У аграсядзібах забаранялася праводзіць банкеты, вяселлі. Зараз жа прапануецца прыбраць гэтыя абмежаванні.

— Калі людзям там зручна правесці дзень нараджэння або вяселле — няхай праводзяць, — аргументаваў Аляксандр Лукашэнка.

Самарэгуляванне бізнесу — асобная тэма.

— Галоўнае — адказнасць бізнесу, — падкрэсліў беларускі лідар. — Мы фактычна здымаем усе бар'еры, якія, можа, недзе і павінны быць і якія ва ўсім свеце маюцца. Мы іх здымаем. З іншага боку — я патрабаваў гэтага — самая жорсткая адказнасць бізнесменаў, кіраўнікоў кампаній за рэзультат, за тое, што адбываецца ў іх на фірме і ў кампаніі. Дапусціў нейкія пралікі, не дай бог, загінулі людзі — прама скажу: збірайся і ідзі ў турму. А як інакш? Дарэчы, бізнесмены — я з многімі сустракаўся і размаўляў — цалкам правільна гэта разумеюць і, наадварот, мяне ўжо многія папярэджваюць: «Глядзіце, не сыдзіце ад кантролю за намі».

Па словах кіраўніка дзяржавы, у любым выпадку ў краіне павінен быць парадак:

— Каб не згубіць кіруемасць у эканоміцы, не справакаваць у краіне бардак — кантроль павінен быць. Я супраць лішняга кантролю, трэба пакінуць тыя кантрольныя функцыі, якія патрэбны дзяржаве.

— Вы — галоўны адказны за гэтыя нарматыўна-прававыя акты — тры іх сёння, — папярэдзіў Прэзідэнт Уладзіміра Зіноўскага. — Як і тыя міністры, якія мне дакладвалі на мінулым тыдні. Я іх папярэдзіў катэгарычна: за гэту прапанову вы несяце персанальную адказнасць. Не дай бог мы нагарадзілі тут нейкіх нормаў, якія не дадуць выніку.

Прэзідэнт падкрэсліў: гэтага быць не павінна, нам не трэба нікому пускаць пыл у вочы.

— Павінны быць дзейсныя нормы, якія ўжо сёння наспелі для прыняцця, або нормы, што здымаюць існуючыя бар'еры. Дакументы павінны быць жывыя і дзейсныя, — упэўнены кіраўнік дзяржавы.

Без цяжкіх штрафаў

Падчас рабочай сустрэчы з Вадзімам Іпатавым, дырэктарам Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў, абмяркоўваўся праект закона, што ўносіць змены і дапаўненні ў Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях і Працэсуальна-выканаўчы кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях. Ён таксама падрыхтаваны ў рамках пакета дакументаў, што накіраваны на развіццё прадпрымальніцтва і стымуляванне дзелавой актыўнасці насельніцтва.

— Пры выпрацоўцы нарматыўна-прававых актаў па змене дзейнасці нашых бізнесменаў, паляпшэнні ўмоў іх жыцця і працы былі скаргі на тое, што ў нас непамерна цяжкія штрафы і адміністрацыйныя пакаранні, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Вы прапануеце гэтыя штрафы істотна паменшыць па пэўных артыкулах — вы даложыце, па якіх.

Дакумент скарачае сферу прымянення практыкі канфіскацыі маёмасці і замацоўвае ўмовы прыцягнення суб'ектаў гаспадарання да адміністрацыйнай адказнасці. Акрамя гэтага, прапануецца таксама выключэнне з заканадаўства шэрагу не запатрабаваных практыкай парушэнняў.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

У тэму

Уладзімір ЗІНОЎСКІ, міністр эканомікі:

— Што да ўказа кіраўніка дзяржавы па рамесніцкай дзейнасці, то там ёсць шэраг навел, якія дапамогуць узмацніць, палепшыць работу рамеснікаў. Пашыраны віды дзейнасці, якой могуць займацца рамеснікі, — гэта, дарэчы, людзі, якія ў асноўным (каля 80%) пражываюць у сельскай мясцовасці. Некаторыя з іх не могуць займацца фізічнай працай у поўнай меры — пенсіянеры; жанчыны, што выхоўваюць дзяцей; інваліды... Гэта ў нейкай меры нават сацыяльны праект.

Вадзім ІПАТАЎ, дырэктар Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў, расказаў, што прыняцце законапраекта, які ён абараняў перад кіраўніком дзяржавы, сыграе станоўчую ролю ў паляпшэнні бізнес-клімату.

— Прэзідэнт падкрэсліў важнасць гэтага дакумента і вызначыў асноўны пасыл, які павінен выконвацца пры далейшай рабоце са згаданым праектам. Гэта баланс інтарэсаў дзяржавы і грамадства. Значыць, адміністрацыйная адказнасць павінна быць жорсткай, непазбежнай, але справядлівай.

Прадпрымальніцтва без рэгістрацыі

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ №337 «Аб рэгуляванні дзейнасці фізічных асоб».

Дакументам пашыраецца пералік відаў эканамічнай дзейнасці, якімі грамадзяне маюць права займацца без рэгістрацыі ў якасці індывідуальных прадпрымальнікаў, пры ўмове выплаты адзінага падатку, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.

У гэты пералік увайшлі такія віды дзейнасці, як рэалізацыя самастойна вырабленых грамадзянамі кулінарных вырабаў, прадастаўленне месцаў для кароткатэрміновага пражывання фізічных асоб, выкананне па заказах спажыўцоў работ па рамонце мэблі, гадзіннікаў і абутку, пашыве адзення, настройцы музычных інструментаў, распілоўцы дроў, пагрузцы грузаў, мураванні печаў і камінаў, а таксама выкананне аддзелачных работ і аказанне грамадзянам паслуг па распрацоўцы вэб-сайтаў, абслугоўванні камп'ютарнага і перыферыйнага абсталявання. У пералік таксама ўключаны паслугі па дызайне памяшканняў, інтэр'ера, мэблі, адзення і абутку, графічным дызайне, касметычныя і цырульніцкія паслугі.

Такім чынам, у пераліку легалізаваныя віды эканамічнай дзейнасці, якія сёння фактычна ажыццяўляюцца фізічнымі асобамі ў хатніх умовах (альбо могуць ажыццяўляцца ў такіх умовах без пагрозы прычынення шкоды як асобна ўзятым грамадзянам, так і грамадству ў цэлым).

УВАГА: ПРАМАЯ ЛІНІЯ

Усё, што вы хацелі даведацца аб працоўным праве

Што лічыцца зменай умоў працы і ці павінен работнік пры гэтым распісвацца ў дадатковым пагадненні? Што рабіць, калі работадавец адмаўляецца своечасова разлічыць работніка пры яго звальненні? Як перайсці з кантрактнай формы найму на бестэрміновы працоўны дагавор? Які мінімальны тэрмін трэба адпрацаваць жанчыне да выхаду ў новы дэкрэт? Ці павінен работадавец выплаціць выхадную дапамогу пры скарачэнні пенсіянера? Ці можна пасля дасягнення дзіцем трох гадоў заставацца з ім дома, але захаваць за сабой працоўнае месца?

Гэтыя і іншыя пытанні вы зможаце задаць, патэлефанаваўшы на прамую лінію гасцям рэдакцыі «Звязды» — юрыстам, **галоўнаму прававому інспектару працы Цэнтральнага камітэта прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Ларысе Васілеўне МАНЮК і галоўнаму прававому інспектару працы Рэспубліканскага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу Сафіі Васілеўне ГРЫШУЦІНАЙ**.

Тэлефануйце **25 верасня з 11 да 13 гадзін** па тэлефоне **8 (017) 287-18-71**.

Папярэднія пытанні можаце задаць 21 і 22 верасня па тэлефоне 8 (017) 287-18-29 у працоўны час або даслаць (з пазнакай «Прамая лінія») на электронны адрас info@zviazda.by або па пошце: вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Хілары Клінтан дапусціла магчымасць аспрэчвання вынікаў прэзідэнцкіх выбараў у ЗША

Экс-дзяржсакратар ЗША Хілары Клінтан не выключае магчымасці аспрэчыць вынікі леташніх усеагульных выбараў. Пра гэта яна заявіла ўчора ў эфіры Нацыянальнага грамадскага радыё ЗША.

«Я не ведаю, ці ёсць правамерны канстытуцыйны шлях зрабіць так», — сказала Клінтан, якая прайграла на выбарах Дональду Трампу, адказваючы на адпаведнае пытанне. Вядучы Тэры Крос паўторна задаў гэтае пытанне, перафармуляваўшы яго з улікам гіпатэтычнай сітуацыі, якая заключаецца ў тым, што ўмяшальніцтва ў ход перадвыбарчай кампаніі ў ЗША, якое прыпісваецца Маскве, акажацца больш глыбокім, чым лічыцца. «Не, я не выключыла б [магчымасць аспрэчыць вынікі галасавання]» — адказала Клінтан.

Яна пазней спаслалася на меркаванне экспертаў, якія лічаць такі варыянт усё ж верагодным. «Я проста не лічу, што ў нас ёсць такі механізм», — дадала былая першая лэдзі.

Пентагон прызнаў, што дыпламатычныя метады ціску на КНДР «працуюць»

Дыпламатыя і палітыка санкцый маюць поспех у аказанні найбольшага ціску на ўлады Паўночнай Карэі. Пра гэта заявіў журналістам кіраўнік Пентагона Джэймс Мэціс, перадае Reuters.

«Так, гэта, працуе» — адзначыў ён.

Кіраўнік амерыканскага абароннага ведамства падкрэсліў, што нават калі ядзерная напружанасць узрастае, ЗША і іх саюзнікі прымяняюць палітыку неўмяшання. Мэціс таксама дадаў, што пакуль Вашынгтону ці каму-небудзь з амерыканскіх саюзнікаў Пхеньян не будзе прама пагражаць, ЗША не стануць збіваць паўночнакарэйскія ракеты ці звяртацца да ваенных мер, каб вырашыць канфлікт.

Раней у панядзелак, 18 верасня, пастаянны прадстаўнік ЗША пры ААН Нікей Хэйлі заявіла, што амерыканскія ўлады ўжо вычарпалі магчымасці ўрэгуляваць паўночнакарэйскую праблему ў рамках ААН, і прапанавала перадаць вырашэнне канфлікту ў рукі Пентагона. У сваім інтэрв'ю тэлеканалу CNN яна нагадала, што Трамп абяцаў адказаць КНДР «агнём і яростю», аднак з моманту, калі гэта заява была зроблена, Пхеньян паспеў правесці некалькі новых ракетных выпрабаванняў, у тым ліку і вадароднай бомбы, а таксама прыгразіў нанесці ўдар па амерыканскай ваеннай базе на востраве Гуам.

Дыпламат падкрэсліла, што словы амерыканскага прэзідэнта не былі пустымі, паводзіны КНДР, на яе думку, застаюцца безадказнымі.

Як калега калегу...

11-гадовы Фрэнк Гіача, які жыве ў прыгарадзе Вашынгтона, напісаў ліст прэзідэнту ЗША Дональду Трампу. Ён расказаў, што адкрыў уласны бізнес — стрыжэ газоны ў сваіх суседзяў. За сваю працу хлопчык бярэ 8 долараў. Фрэнк напісаў, што паважае Трампа як бізнесмена і прапанаваў пастрыгчы газон каля Белага дома бясплатна. Дзіцяці адказалі. А 15 верасня Фрэнк ужо стрыг лужок у Ружавым садзе ля сцен Белага дома, а за яго работай назіраў асабіста прэзідэнт ЗША, паведамляе «Голас Амерыкі».

Дональд Трамп увесь час быў побач з хлопчыкам, але той, здаецца, не заўважаў прысутнасці кіраўніка дзяржавы і засяроджана выконваў сваю работу. Пасля Трамп запрасіў Фрэнка разам з яго бацькам у Авальны кабінет. У Twitter прэзідэнт падзякаваў хлопчыку і адзначыў яго заслугі.

Прэзідэнт таксама напісаў, што Нацыянальная паркавая служба ЗША ставіць Фрэнку пяць балаў за яго працу.

■ Рэйтынгі

ВЫХАВАЛІ, НАВУЧЫЛІ І... ПРАЦАЎЛАДКАВАЛІ

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт стаў адзінай беларускай ВНУ, якая трапіла ў ТОП-500 міжнароднага рэйтынгу ўніверсітэтаў па працаўладкаванні выпускнікоў, па версіі ўплывовага брытанскага рэйтынгавага агенцтва QS.

Рэйтынг QS GER (Graduate Employability Rankings) ацэньвае вядучыя сусветныя ўніверсітэты па наступных крытэрыях: пад увагу бяруцца рэпутацыя ўніверсітэта сярод работадаўцаў, супрацоўніцтва ВНУ з работадаўцамі, прафесійныя дасягненні выпускнікоў, арганізацыя ўзаемадзеяння работадаўцаў са студэнтамі і ўзровень занятасці выпускнікоў.

Па такім паказчыку, як «прафесійныя дасягненні выпускнікоў», БДУ займае 172-ю пазіцыю ў свеце, а па ўзроўні занятасці сваіх выпускнікоў — 115-е месца ў свеце!

— Мы ганарымся і сваімі выпускнікамі, і нашай рэпутацыяй сярод работадаўцаў. І нам вельмі прыемна, што комплексная работа Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта па працаўладкаванні выпускнікоў, правядзенні для іх маштабных мерапрыемстваў па пошуку працы была высока ацэнена міжнароднымі экспертамі і самімі работадаўцамі, — падкрэслівае рэктар БДУ, акадэмік Сяргей АБЛАМЕЙКА. — Універсітэт праводзіць дзясяткі мерапрыемстваў для студэнтаў выпускных курсаў: Дні кар'еры — восенню і вясной, ушчыльную працуе з заказчыкамі кадраў, створана электронная база партфоліа выпускнікоў.

Па традыцыі пазіцыі ўверсе рэйтынга QS GER займаюць амерыканскія ВНУ: Стэнфардскі ўніверсітэт, Каліфарнійскі ўніверсітэт Лос-Анджэлеса, Гарвардскі ўніверсітэт. З універсітэтаў краін СНД, а таксама нашых найбліжэйшых суседзяў у рэйтынг трапілі 11 расійскіх універсітэтаў, адна ВНУ з Казахстана, па дзве — з Латвіі і Эстоніі і па тры — з Літвы і Польшчы.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

ВЫПРАБАВАННЕ АГНЁМ

ЗАВЯРШАЕЦЦА СУМЕСНАЕ СТРАТЭГІЧНАЕ ВУЧЭННЕ

Учора, у перадапошні дзень беларуска-расійскіх манеўраў, на палігоне Даманава, што на Брэстчыне, экзамен трымалі зенітчыкі.

Фота Надзеі БУЖАН.

Цішыню парушыла пара верталётаў Мі-8. Роўным клінам над нашымі галовамі праляцела звяно вучэбна-баявых самалётаў Як-130. Сёння авіяцыя Ваенна-паветраных сіл і войскаў проціпаветранай абароны Узброеных Сіл Беларусі — умоўны праціўнік.

Удары з неба адбівае змешанае падраздзяленне ў складзе дывізіёна зенітна-ракетнага комплекса С-300 і зенітна-ракетнай батарэі «Аса». Усё — пры ўзаемадзеянні з падраздзяленнямі вайсковай проціпаветранай абароны. Усяго на палігоне задзейнічана каля 150 чалавек і 45 адзінак ваеннай і спецыяльнай тэхнікі.

— Сёння камандаваннем Ваена-паветраных сіл і войскамі проціпаветранай абароны адпрацоўваюцца такія пытанні, як адбіццё ўдараў сродкаў паветранага нападзення праціўніка і наступлення яго ж сухапутных груповак войскаў, — адзначыў **намеснік камандуючага ВПС і войскамі ППА генерал-маёр Андрэй ГУРЦЭВІЧ.** — Акрамя таго, на практыцы рэалізуецца арганізацыя ўзаемадзеяння і ўсебаковага забеспячэння ў інтарэсах рашэння пастаўленых задач.

Стральбу па паветраных мішэнях вядуць баявыя машыны «Аса», разлікі зенітна-ракетнага комплексу «Ігла», а таксама зенітнай установкі 23-2. Агнявыя задачы выкананы — змешанае падраздзяленне пераводзіцца ў паходнае становішча і перамяшчаецца на іншую пазіцыю.

Як падзяліўся назіральнік за вучэннем з Эстоніі **падпалкоўнік Каўпа КІЙС,** вайскоўцы паказалі сябе вельмі прафесійна. «У мяне ёсць вопыт прысутнасці на падобных вучэннях у Нарвегіі, Румыніі, — падкрэсліў ваеннаслужачы. — Што тычыцца вучэння ў Беларусі, усё адпавядае таму, што было заяўлена загадзя».

❍ Даслоўна

Начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны Беларусі Уладзімір МАКАРАЎ:

— Працягваецца другі этап беларуска-расійскага сумеснага стратэгічнага вучэння «Захад-2017», у ходзе якога адпрацоўваюцца пытанні кіравання войскамі (сіламі) ва ўмовах абстаноўкі, якая хутка мяняецца, а таксама пытанні арганізацыі ўзаемадзеяння і ўсебаковага забеспячэння пастаўленых задач. Штабы розных узроўняў працягваюць адпрацоўваць пытанні, звязаныя з кіраваннем войскамі (сіламі) пры вядзенні манеўранай абароны. Ажыццяўляюцца збор, аналіз і абагульненне даных абстаноўкі, на аснове якіх прымаюцца рашэнні, удакладняюцца задачы, адбываецца бесперапыннае кіраванне войскамі падчас выканання вучэбна-баявых задач.

Вераніка КАНЮТА. *kanyuta@zviazda.by*

Брэсцкая вобласць.

■ Ну і ну!

ПАКВАПІЛІСЯ НА СУМКУ?

А буйную суму ў валюце з яе... выкінулі

Незвычайнае здарэнне адбылося ў Маладзечне. Тут сям'я ад'язджала на дачу і ў спешцы забылася на вуліцы сумку з рэчамі, сярод якіх была і ўпакоўка ад мабільнага тэлефона. А ў ёй — 14,5 тысячы долараў...

Гэтую кардонку сям'я з мужа, жонкі і дваіх дзяцей выкарыстала ў якасці адмысловага «сейфа» для грашовых зберажэнняў. Гаспадары хапіліся яе, толькі прыехаўшы на дачу. Адразу патэлефанавалі ў міліцыю. На месцы, дзе забыліся сумку, праваахоўнікі нічога не знайшлі. Тым часам у горад вярнуліся і муж з жонкай. І вось, як расказалі ў Маладзечанскім РАУС, у адным са смеццевых бакаў аператыўная група знайшла раскіданыя рэчы, якія ляжалі ў той самай сумцы, і апроч іншага — упакоўку ад мабільніка. А ў ёй — цалюткія 14,5 тысячы долараў! Хто быў той зладзюжка, які паквапіўся на чужое, і чым ён кіраваўся, застаецца толькі здагадвацца. Між іншым, з усёй маёмасці знікла толькі адна тая сумка...

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

■ Прамая лінія

ПАСКАРДЗІЛІСЯ НАВАТ НА... КАРОЎ!

У мінулую суботу карэспандэнт «Звязды» пабываў на прамой ліні, якую праводзіла намеснік старшыні Гарадоцкага райвыканкама Марына ЗДОЛЬНІКАВА.

Марына ЗДОЛЬНІКАВА, намеснік старшыні Гарадоцкага райвыканкама па сацыяльных пытаннях.

Жыхар вёскі Кірэева выказаў нараканні наконт аўтакрамы. Невялікі населены пункт знаходзіцца прыкладна за 30 кіламетраў ад Гарадка, і гандлёвае абслугоўванне «з колаў» там наладзілі нядрэнна. Але тутэйшым хочацца, каб асартымент харчовай прадукцыі быў больш багаты. У прыватнасці, каб у ім прысутнічалі кілька кансерваваная, ліверная каўбаса і крывянка. Яшчэ пенсіянер агучыў дарожную праблему — вяскоўцы спадзяюцца, што гэтай зімой дарогу будуць лепей чысціць ад снегу...

Жыхарка Віцебска, дачніца, паскардзілася на перыядычнае адключэнне электраэнергіі ў вёсцы Пруднікі. А тарыф для дачнікаў у два разы вышэйшы.

Заяўніца з гарадскога пасёлка Езярышча расказвала пра тое, што яе зямельны ўчастак залівае. Вінаватыя ў гэтым, на думку жанчыны, дарожнікі. На яе погляд, яны не могуць правільна наладзіць функцыянаванне сістэмы сцёку вады.

Апошняй патэлефанавала жанчына, якая паскардзілася на кароў. Маўляў, каля шасці гадзін раніцы на сваім агародзе ўбачыла статак, які належыць мясцовай гаспадарцы. Капытныя затапталі агародніну і сена, тое-сёе з'елі. І раней, як падкрэсліла заяўніца, жывёлы прыносілі аналагічную шкоду...

Кожная праблема, упэўніла намеснік старшыні, будзе пільна вывучана, пастаўлена на кантроль, а грамадзяне атрымаюць адказы па пытаннях, якія іх хвалююць. Усяго сёлета ў райвыканкаме зарэгістравалі каля 270 зваротаў, у тым ліку 175 — пісьмовых. На асабістых прыёмах кіраўнікі мясцовай улады ўзялі на заметку больш за 90 «сігналаў» ад насельніцтва. У «топавым» спісе пытанні, якія датычацца ЖКГ, стану і абслугоўвання дарог, жыллёвага заканадаўства. Практыку правядзення сумесных прамых ліній з кіраўнікамі мясцовай улады «Звязда» будзе працягваць і надалей.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

Стаўку ізноў «падрэжуць». Яшчэ сёлета

Кіраўніцтва Нацбанка не выключае далейшага зніжэння стаўкі рэфінансавання ў гэтым годзе, заявіў намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Сяргей КАЛЕЧЫЦ.

Намеснік старшыні лічыць, што той узровень інфляцыі, які ёсць сёння, дазваляе ў цэлым па годзе з улікам магчымых змяненняў ацэньваць яе ў адносінах снежань да снежня ў межах 6—7%. «Гэта сведчыць аб тым, што з пункту гледжання гэтага фактару, які, безумоўна, з'яўляецца адным з асноўных пры разглядзе пытання аб змене стаўкі рэфінансавання, ды і астатніх фактараў (стану рынку дэпазітаў і крэдытнага рынку), магчымасці для разгляду пытання аб зніжэнні стаўкі, вядома, ёсць», — заявіў Сяргей Калечыц.

Але цяпер гэта зніжэнне будзе ісці больш асцярожнымі тэмпамі, удакладніў намеснік старшыні праўлення Нацбанка, які нагадаў, што «Сёлета мы зрабілі ўжо дастаткова шмат крокаў у гэтым напрамку, гэта дазволіла наша эканамічная сітуацыя. І калі мы будзем казаць аб магчымым зніжэнні, то ўжо не такімі тэмпамі. Крок будзе больш асцярожны, чым 1—2%, як раней».

Сяргей КУРКАЧ.

Ёсць трохмільённы пасажыр

У Нацыянальным аэрапорце днямі сустракалі трохмільённага пасажыра з пачатку года.

«Юбілейным» аказаўся грамадзянін, які прыляцеў з Дамадзедава рэйсам авіякампаніі «Белавія». Летась аэрапорт прыняў трохмільённага пасажыра 10 лістапада. Сёлета такая сустрэча адбылася на некалькі месяцаў раней, што сведчыць пра стабільны рост пасажырапатоку.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Кнігавыданне з «кітайскім характарам»

У выдавецтве «Мастацкая літаратура» прайшлі перамовы кіраўніцтва з прадстаўнікамі «Кітайскай выдавецкай групы».

Тэма абмеркавання сумесных кнігавыдавецкіх праектаў узнікла не выпадкова. У ранейшыя гады «Мастацкая літаратура» прадставіла айчыннаму чытачу кнігу публіцыстыкі лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Міхася Шыманскага «Блізкі Кітай» і зборнік вершаў класіка кітайскай паэзіі Лі Бо. Абедзве кнігі пабачылі свет на рускай мове. Цяпер у выдавецтве рыхтуецца да выдання першая кніга з сямітомніка «Культура Кітая». Гэты праект рэалізуецца ўжо на беларускай мове.

— Канешне ж, нам хацелася б пазнаёміць беларускага чытача з кітайскай мастацкай літаратурай, — зазначае **дырэктар выдавецтва Алесь БАДАК.** — Не супраць падтрымаць нас у гэтым кірунку і «Кітайская выдавецкая група». Пра гэта заўважыў на перамовах віцэ-прэзідэнт найбуйнейшай кітайскай выдавецкай кампаніі спадар Лі Ян. Ужо, відавочна, даўно наспела патрэба выдаць па-беларуску лаўрэата Нобелеўскай прэміі Мо Яня. Выдаюць жа яго ва Украіне, Расіі. І, здаецца, не ўзнікае ніякіх пытанняў з атрыманнем правоў.

У сваю чаргу спадар Лі Ян заўважыў, што і ў Кітаі хацелі б выдаваць беларускіх пісьменнікаў на кітайскай мове.

Сяргей ШЫЧКО.

Вецер зноў «клаў» дрэвы

З-за парываў ветру (да 23 м/с) у панядзелак пацярпелі шэсць населеных пунктаў у чатырох раёнах Гродзенскай і Мінскай абласцей, паведамілі ў Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях.

Пашкоджаны дахі двух жылых дамоў і чатырох сельскагаспадарчых будынкаў. Зафіксаваны 55 выпадкаў падзення дрэў, у выніку якіх пашкоджаны пяць легкавых аўтамабіляў. У выніку выпадзення багатых ападкаў у выглядзе дажджу ў Браславе былі падтопленыя шэсць прыватных падворкаў і тэрыторыя аддзела адукацыі, спорту і турызму райвыканкама. Пацярпелых няма. Работнікамі МНС і іншых арганізацый праводзіліся работы па распілоўцы і ўборцы дрэў, якія ўпалі, ліквідацыі наступстваў падтапленняў.

Па звестках «Белэнерга», на працягу сутак на тэрыторыі краіны перыядычна парушалася электразабеспячэнне 715 населеных пунктаў. Адключэнні аператыўна выпраўляліся аварыйнымі брыгадамі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Ішоў цераз пуці ў навушніках...

Яшчэ не высахлі слёзы па ахвярах аварыі на чыгуначных пуцях у Іванаўскім раёне, як прыйшло новае паведамленне пра трагедыю. Гэтым разам бяда здарылася ў Баранавічах.

Афіцыйны прадстаўнік Брэсцкага абласнога УУС Сяргей ДУЧЭНКА паведаміў, што недалёка ад станцыі Баранавічы-Цэнтральныя пуцявой машынай (цеплавоз і дзве платформы) быў смяротна траўмаваны жыхар вёскі Лясная. У выніку аварыі 18-гадовы хлопец застаўся без ног, яму адарвала пальцы на адной з рук, таксама была зафіксавана чэрапна-мазгавая траўма. Пацярпелага даставілі ў бальніцу, дзе яму правялі неабходныя аперацыі, але ў ноч на аўторак хлопец памёр.

Юнак вучыўся ў Мінскім ПТК чыгуначнага транспарту і ўжо хутка сам павінен быў сачыць за бяспечнымі паводзінамі на чыгункі. Але трапіў пад састаў, калі ішоў па пуцях у навушніках, таму і не пачуў набліжэння машыны.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Дзве смерці запар на трасе

У Нясвіжскім раёне два чалавекі, якія выйшлі з машыны на трасе М1, былі збітыя транспартнымі сродкамі, паведамілі ва УДАІ УУС Мінаблвыканкама.

Здарэнне адбылося прыблізна ў 22.30 на 256-м кіламетры аўтадарогі Брэст—Мінск—мяжа РФ паблізу вёскі Малінаўка. Пасля вымушанага спынення ў паласе разгону каля асветленай стаянкі 30-гадовы пасажыр аўтамабіля «Хёндаі Санта Фе» не ўпэўніўся ў бяспецы і выйшаў на праезную частку. Там яго збіў аўтобус «Неаплан 116», які ехаў ў напрамку Брэста. Збіты застаўся ляжаць на праезнай частцы. Пасажыры легкавіка — жанчына і мужчына — пабеглі да пацярпелага для аказання дапамогі. У гэты момант на яго здзейсніў наезд «Пежо Партнёр». Жанчына паспела адскочыць у бок, а мужчына трапіў пад колы машыны. Два мужчыны загінулі на месцы. Абставіны ДТЗ установіць следства. Вядома, што ніхто з іх не быў пазначаны святлоадбівальнымі элементамі. Распачаты крымінальныя справы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Информация о совершении сделки, в отношении которой имеется заинтересованность аффилированного лица

Полное наименование и местонахождение эмитента	Открытое акционерное общество «Амкодор-КЭЗ» 211060, г. п.Коханово, ул. Промышленная, 3 Промышленная зона, Толочинский район, Витебская область
Дата принятия решения о совершении сделок	18.09.2017 г.
Вид сделки	Договор займа
Стороны сделки	Яроцкий А.В. и ОАО «Амкодор-КЭЗ»
Предметы сделки	Предоставление беспроцентного займа
Критерии заинтересованности	Аффилированное лицо является стороной сделки
Балансовая стоимость активов (стоимость активов), определенная на основании данных бухгалтерской (финансовой) отчетности за последний отчетный период, предшествующий дню принятия решения о совершении такой сделки (стоимости активов)	На 01.09.2017 г. – 8751 тыс. белорусских рублей

УНП 300028841

■ Клопат пра будучыню

РУХАВІК ЭКАНОМІКІ — КРЭАТЫЎНАЯ МОЛАДЗЬ

Як з таленавітага школьніка атрымаць інавацыйнага бізнесмена?

У банку адоранай моладзі налічваецца 882 студэнты ВНУ, 71 магістрант і 240 аспірантаў. Як не прапусціць талент, павялічыць гэты інтэлектуальны рэзерв і ў будучыні эфектыўна задзейнічаць на прадпрыемствах? Меркаваннем падзяліліся спецыялісты.

У банк адораных уваходзяць пераможцы міжнародных прадметных алімпіяд, творчых конкурсаў і фестываляў.

— Дзяржава ўзяла на сябе місію зафіксаваць самыя значныя вынікі і аказаць падтрымку таленавітым маладым людзям. Гэты інструмент выклікае захапленне і нават зайздрасць у замежных калег, — адзначае **загадчыца кафедры маладзёжнай палітыкі і сацыякультурных камунікацый Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы Людміла КАЖУХОЎСКАЯ**.

Па яе словах, у нас добра развіты інстытут куратарства. Так, былы школьнік, які праявіў сябе на алімпіядзе, пры паступленні ва ўніверсітэт не страціць свой патэнцыял. За юнаком замацуюць куратара, які выбудуе яго адукацыйную і навуковую дзейнасць ад першага дня да моманту размеркавання.

Аднак ёсць пытанне, якое патрабуе ўвагі, — гэта суправаджэнне адоранай моладзі на працоўных месцах. Трэба наладзіць сувязь паміж работадаўцамі і ўстановамі вышэйшай адукацыі.

Памножыць магчымасці маладога пакалення і выявіць іх здольнасць займацца бізнесам дазваляе стартап-рух. Людзі, якія ўдзельнічаюць у такіх мерапрыемствах, з'яўляюцца рэзервам для фарміравання крэатыўнага класа. А гэта неад'емны элемент эканомікі ведаў, да якой імкнецца наша краіна.

— Сёння крэатыўны клас — гэта крыху больш за 80 тысяч чалавек. Сярод іх даследчыкі-распрацоўшчыкі, вынаходнікі-рацыяналізатары, праграмісты, дызайнеры, маркетолагі і інавацыйныя прадпрымальнікі. А ў эканоміцы Беларусі занята 4,4 мільёна чалавек. Якасны зрух адбудзецца, калі доля крэатыўнага класа складзе 10 працэнтаў, — кажа **начальнік упраўлення эканомікі інавацыйнай дзейнасці Міністэрства эканомікі Дзмітрый КРУПСКІ**.

Стартап-рух у Беларусі набірае моц. Толькі параўнайце: калі ў 2012 годзе правялі 167 тэматычных мерапрыемстваў, дзе сабралася восем тысяч чалавек, то за мінулы год гэта ўжо 375 мерапрыемстваў і 20 тысяч удзельнікаў. Даць яшчэ большае развіццё гэтаму руху павінны новыя законы. Цяпер ва Урадзе знаходзіцца падрыхтаваны праект дэкрэта аб Парку высокіх тэхналогій. Ён прадугледжвае пэўныя льготы для інавацыйнага бізнесу. Дзмітрый Крупскі мяркуе, што пасля прыняцця дэкрэта ў год будзе інкубавацца 30—50 праектаў, а не 10—15, як зараз. За пяць гадоў пры нармальным ходзе падзей можна будзе «вырасціць» да 200 стартапаў. Гэта моцны інструмент для таго, каб эканоміка ведаў у нашай краіне прырастала.

Плануецца дапоўніць Указ №255 ад 2009 года: новая норма ўвядзе субсідыі для арганізатараў стартап-мерапрыемстваў. Дзяржпадтрымка дазволіць пакрываць асноўныя віды выдаткаў: выраб раздатачнага матэрыялу для ўдзельнікаў, аплата праезду экспертаў, працы бізнес-трэнераў і харчавання. Плануецца, што змены ва ўказе будуць прыняты ў першым квартале наступнага года. Але трэба адзначыць, што падобная дапамога ўжо аказваецца: у рамках Дзяржаўнай праграмы падтрымкі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва на 2016—2020 гады на арганізацыю стартап-мерапрыемстваў запланавана выдзяленне сродкаў у памеры амаль 453 тысячы рублёў. У сталіцы гэтым карыстаюцца, а ў рэгіёнах пакуль з асцярогай ставяцца да новага інструмента.

Эксперт Мінэканомікі тлумачыць, чаму за стартап-рухам будучыня:

— Мы жывём у эпоху перамен. Навука стала рухаючай сілай. Любы бізнес мае на ўвазе выкарыстанне вынікаў навукова-практычнай дзейнасці і адпаведна камерцыялізацыю інавацый. Без гэтага ты ўжо не выйграеш у канкурэнтаў, збанкруцішся.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

ЦІ ЎСІМ БЫЦЬ ВУНДЭРКІНДАМІ?

НЕ СТАЎЦЕ ЭКСПЕРЫМЕНТЫ

Як дапамагчы немаўляці своечасова раскрыць свае здольнасці і не перагрузіцца інфармацыяй, як даведацца, што малы развіваецца «не па плане», і дзе шукаць дапамогі, карэспандэнт «Звязды» пацікавілася ў спецыялістаў.

— Наведваючы цэнтры ранняга развіцця, важна трапіць у рукі педагога, які ўмее і ведае, як працаваць з малымі. Такія ўстановы, як правіла, маюць добрае абсталяванне і дастаткова цацак. Аднак, на жаль, у некаторых цэнтрах з малымі працуюць спецыялісты, якія не маюць патрэбных ведаў і вопыту працы з дзеткамі да трох гадоў. Павярхоўнае веданне ўзроставай псіхалогіі і перыядызацыі ўменняў дзіцяці прыводзіць да таго, што заняткі маюць забаўляльны, а не развіваючы характар. Напрыклад, малым прапануюць у годзік нарэзаць паперу, каб зрабіць траву для вырабу, а ў паўтара — вучаць чытаць па кубіках Зайцава, — адзначыла **Таццяна КУЛАШЧЫК, настаўнік-дэфектолаг Цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі**.

Ілона ГЕРАШЧАНКА, магістр псіхолага-педагагічных навук, стваральнік міжнароднага адукацыйнага цэнтра Global Child, аўтар методыкі дыягностыкі асобаснага патэнцыялу дзіцяці, упэўнена: як толькі дзіця пачынае садзіцца (месяцаў з шасці), яно гатовае стаць кліентам цэнтраў ранняга развіцця. Спецыялісты-прафесіяналы, якія ўмеюць карыстацца кожным момантам росту дзіцяці ў гэты час, дапамагаюць маладым бацькам рабіць тое, што ідзе на карысць дзецям, падказваюць, чым яны могуць займацца з малым самастойна, як яго развіваць.

— Ранні ўзрост (ад шасці месяцаў да трох гадоў) павінен быць менавіта ўзростам развіцця, а не навучання. Развіццё — гэта якасныя змены ў немаўляці, якія праяўляюцца ў розных уменнях: трымаць галоўку, садзіцца, хадзіць, размаўляць... Гэта адбудзецца з ім незалежна ад таго, ці будзе нехта займацца з малым або яго пакінуць самога па сабе. А вось навучанне — гэта ўжо ўплыў на дзіця, спецыяльна арганізаваны педагогам працэс уздзеяння на вучня, — мяркуе Ілона Герашчанка. — На жаль, у цэнтрах часта, у тым ліку і праз жаданне бацькоў, стараюцца як мага раней навучыць малога чытаць і пісаць. Аднак усяму свой час. Даючы пэўныя веды раней, мы выкідваем грошы і стамляем дзіця, якое не разумее, што ад яго хочуць, і нервуецца. Важна не ставіць на дзецях эксперыменты, якія могуць нашкодзіць.

Васіліна ЖАРНАК: «Кожнае дзіця індывідуальна рэагуе на заняткі ў развіваючых цэнтрах. Звычайна ў прыватных гуртках не больш за дзесяць малых, а ў групе дзіцячага садка іх 20 і больш. І дзіця, якое было лідарам у цэнтры, можа «згубіцца» ў садку сярод іншых, і бацькі пачынаюць трывожыцца, што здарылася з іх разумнай «зоркай». З другога боку, дзеці, якія дадаткова займаюцца ў цэнтрах, на агульнаадукацыйных занятках у садку хутчэй выконваюць заданні. Аднак гэта можа прывесці да самаўпэўненасці, што ён і так усё ведае. І ў выніку з'яўляецца магчымасць затухання адукацыйнага працэсу, што паўплывае на паспяховасць у школе».

ВУЧЫЦЕСЯ ГУЛЯЦЬ

Толькі 30% здольнасцяў дзіцяці перадаюцца яму генетычна, астатняе закладваецца сацыяльным асяроддзем. Мозг немаўляці пачынае развівацца ўжо на 3—4-м тыдні цяжарнасці, і першая інфармацыя паступае да яго яшчэ ў матуліным жываце.

Ілона ГЕРАШЧАНКА: «Развіваць дзіця ніколі не рана. Але калі вы хочаце рабіць гэта правільна і ў дапамогу дзіцяці, а не ў нагрузку яму, пільна выбірайце гурткі. Калі ў цэнтры развіцця вам не адкажуць, навошта яны прапануюць рабіць нешта канкрэтнае (напрыклад, вучыць словы і літары) у пэўным узросце, гэта нагода насцярожыцца, што дзіця проста надрэсіруюць на запамінанне, не звяртаючы ўвагі на яго ўзроставыя магчымасці. Заставайцеся побач з малым, вучыцеся, як займацца з ім дома».

— Пасля нараджэння мозг развіваецца паэтапна адпаведна сталенню дзіцяці. Таму ў кожным узросце вельмі важна задзейнічаць пэўныя працэсы, рабіць тыя дзеянні, якія дапамогуць мозгу развівацца адпаведна сваёй фізіялогіі, з аднаго боку, а з другога — дасягнуць таго, што бацькі хочуць атрымаць ад дзіцяці ў выніку развіцця і навучання, — перасцерагае Ілона Герашчанка.

Апошнія гадоў сем назіраецца перакос у бок інтэлектуальнага развіцця дзяцей, а пра эмацыйны стан немаўляці бацькі забываюцца, сведчаць спецыялісты.

— Часам сустракаеш дзетак, якія ведаюць у 2,5 года алфавіт, але не могуць сказаць «мама». Малы запамінае сімвалы, якія для яго нічога не значаць, але не мае камунікатыўных навыкаў. Наведванне цэнтраў ранняга развіцця для некаторых — увогуле фанабэрыстае спаборніцтва паміж мамамі, хто з дзяцей што ўмее. Зразумела, гэта не на карысць малым, тым больш што многія веды, якія даюцца ў такіх установах, пасля дублююцца ў школе, — папярэдзіла **Аліна НІЧКАСАВА, псіхолаг Цэнтра ранняга ўмяшання 19-й дзіцячай паліклінікі г. Мінска**. — На жаль, страчаны традыцыі гульні. А менавіта ў ёй нараджаецца эмацыйны інтэлект, які пасля фарміруе асобу. Чым лепш малы навучыўся гуляць, тым больш паспяховы ён будзе пасля ў навучанні. У цэнтры з малымі паляпілі, памалявалі, нешта яшчэ парабілі, а дома бацькі ўключылі ім мульцікі ці далі планшэт — і ўся гульня. Нават у двары яны цяпер хваляцца новымі гульнямі на тэлефоне, а не гуляюць разам.

З двух гадоў дзяцей трэба пачынаць не толькі і не столькі развіваць, як сацыялізаваць, каб яны лягчэй адаптаваліся да дзіцячага садка, а пасля — да школы, упэўнены педагогі. Для гэтага цудоўна падыходзяць розныя гурткі, асабліва тыя, што створаны непасрэдна пры гэтых установах.

— Як паказвае практыка, дзеці значна лягчэй адаптуюцца да садка і пераносяць адсутнасць бацькоў, калі перад гэтым займаюцца ў гуртку пры садзе, — запэўніла **Васіліна ЖАРНАК, намеснік загадчыка па асноўнай дзейнасці дзіцячага сада-ясляў №218**. — Спачатку малыя прыходзяць да нас на заняткі разам з мамамі. Мы гадзіну займаемся з імі фізкультурай, малюем, развіваем мову. Пасля пакрысе бацькі застаюцца за дзвярыма, а дзеці незаўважна прывыкаюць да рэжыму дашкольнай установы. Што датычыцца іншых гурткоў, я вельмі рэкамендавала б хадзіць у басейн. Гэта дапаможа загартаваць і ўмацаваць малога.

РАЗВІВАЙЦЕ Ў ХАТНІХ УМОВАХ

— Калі сям'я не ўпэўнена, ці правільна развіваецца немаўля, не трэба спрабаваць «выправіць» дзіця, аддаючы яго ў цэнтр ранняга развіцця. Неабходна ісці да прафесіяналаў: дэфектолагаў і псіхолагаў, якія валодаюць спецыяльнымі методыкамі развіцця малых. Яны працуюць у кабінетах ранняй комплекснай дапамогі пры паліклініках і ў цэнтрах карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, якія існуюць у кожным раёне Мінска, — параіла Таццяна Кулашчык.

Мозг на 90% фарміруецца да шасці гадоў, але працягвае развівацца ўсё жыццё.

У сталіцы існуе сем цэнтраў ранняга ўмяшання, што працуюць у сістэме аховы здароўя. Іх спецыялісты дапамагаюць развіваць дзіця адпаведна запытам бацькоў. Сутнасць такой тэхналогіі ў тым, што маці можа пракансультавацца з камандай спецыялістаў: дактаром, лагапедаў, псіхолагаў, каб атрымаць ацэнку развіцця свайго немаўляці пачынаючы з двух месяцаў. Калі патрэбна дапамога, малых уключаюць у праграмы, якія будуюцца на супрацоўніцтве бацькоў і спецыялістаў. Гэта можа быць кароткатэрміновая работа цягам трох месяцаў. Маніторынгавая — калі сям'ю кансультуюць і вучаць прыёмам камунікацыі, сумеснай гульнявой дзейнасці, правільным рухам і раз на два месяцы сочаць за іх поспехамі. Доўгатэрміновая праграма паказана дзецям, якія маюць затрымку ў развіцці. Уся дапамога — бясплатная.

— Здараецца, да нас прыходзяць маладыя мамы, якім цяжка наладзіць адносіны са сваім немаўлём, якія не адчуваюць з ім сувязі. І вельмі важна, што спецыялісты могуць падказаць, як развіваць дзіця ў хатніх умовах, выкарыстоўваючы прадметы з быту. Як стымуляваць яго рухі, што рабіць, калі малы пачынае пераварочвацца, паўзці, якія цацкі даваць, каб яны адпавядалі ўзроставым нормам і ўзроўню развіцця, — расказала Аліна Нічкасава. — Выконваючы рэкамендацыі спецыялістаў, сям'я можа мінімізаваць рызыку нейкіх магчымых праблем, што маглі б развіцца пазней. Мозг пластычны, і чым раней займацца нюансамі яго развіцця, тым лепш. Такі від дапамогі малым у супрацоўніцтве са спецыялістамі вельмі добры, бо ўкараняецца ў натуральным асяроддзі.

Ірына СІДАРОК.
sidarok@zviazda.by

Аліна НІЧКАСАВА: «Бацькі могуць стварыць натуральнае асяроддзе для развіцця малога самастойна. Напрыклад, вучыць назвы прадметаў (агародніны), гатуючы суп, а на каструлях-патэльнях — пазнаваць гукі. Да першага года жыцця я раю рабіць для развіцця малога «англійскую карзіну». Пакласці ў скрынку рэчы, якія будуць бяспечныя для дзіцяці, каб яно вывучала іх навобмацак і смак, даведвалася, што такое «халодны», «шурпаты», «мяккі» і іншыя ўласцівасці прадметаў. Гэта можа быць мачалка, шчотка. З 1,5—2 гадоў можна вывучаць паняцці «аднолькавы» (складваючы шкарпэткі), «вялікі/маленькі» (ставячы да абеду талеркі ды лыжкі). З малымі трэба гуляць «сюжэтна»: у доктара, кухара, кіроўцу. Тварыць з дзецьмі і паказваць, як цікава можна выкарыстоўваць прадметы. Напрыклад, кубачкі можна сартаваць па памерах, «гатаваць» у іх, рабіць з іх фантаны ў ванне ці капялюшыкі для сябе, лялькі ці матулі».

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Мясцовае самакіраванне

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

20 верасня 2017 г. №35 (419)

стар. 3

Як дажыць да 100 гадоў?

стар. 5

Добра там, дзе мы ёсць

стар. 8

Паляванне завяршылася... у ізалятары

ТЭМА ТЫДНЯ

ГОРАД У СЕЛЬСКАЙ МЯСЦОВАСЦІ

Ці вырашаць аграгарадкі кадравую праблему ў аграпрамысловым комплексе?

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЯКОЕ пытанне найбольш актуальнае для краіны, дзе вырабляюць высакаякасную сельскагаспадарчую прадукцыю, вядомую ва ўсім свеце? Насамрэч пытанняў заўсёды шмат — вырасціць прадукцыю, гарантаваць харчовую бяспеку, забяспечыць экспартныя пастаўкі...
Але не варта забываць, што за кожным цэнтнерам збожжа і літрам малака стаяць людзі, якія працуюць у сельскай мясцовасці. А каб ім працавалася добра, трэба стварыць умовы для работы і вольнага часу. У нашай краіне знайшлі выйсце — стварылі аграгарадкі.
Гэта беларускае ноу-хау — невялікі горад з развітой інфраструктурай непасрэдна на месцы вёскі.
Наколькі эфектыўная гэта ідэя і якія праблемы яна вырашыла, карэспандэнт МС паспрабаваў ацаніць разам з дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Дзмітрыем ГОБАРАВЫМ.

стар. 4

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

ЯК ПІЦЬ ДАЦЬ?

Чаму ў ашмянскіх калодзежах не хапае вады

Пітная вада ў Ашмянскім раёне — асаблівая. Гарадскія і вясковыя калодзежы «працуюць» у асноўным на паверхневых водах, якія не могуць пахваліцца добрым смакам. Вада мае бруднаваты колер і ўтрымлівае ў два разы больш жалеза, чым дапускаецца нормамі. Каб яна стала якаснай, неабходны станцыі абезжалезвання. Ашмянскія ўлады ўжо прапанавалі на ўзроўні рэспублікі ўнесці ў сацыяльныя стандарты абавязковае ўзвядзенне такіх станцый пры стварэнні аграгарадкоў з колькасцю жыхароў ад 1000 чалавек і больш.

Як «памыць» ваду

На водазаборы Вайгета, ад якога сілкуецца ўвесь горад, станцыя абезжалезвання працуе. Дзякуючы гэтаму ў Ашмянах водаправодная вада якасная. У аграгарадках, што забяспечваюцца вадой са станцый на водазаборах у Гальшанах і Граўжышках, з кранаў таксама цячэ якасны прадукт.

Іншая справа — сельская мясцовасць, дзе без станцый абезжалезвання палепшыць якасць вады можна толькі з дапамогай фільтраў. Аднак праз павышаную колькасць у вадзе жалеза іх трэба мяняць значна часцей, чым звычайна. Пакутуе і бытавая тэхніка, што кантактуе з вадой, — «рыжыя літры» значна скарачаюць тэрмін службы прыбораў.

— Асноўны ўпор на забеспячэнне якасці вады мы робім у аграгарадках. Станцыі абезжалезвання жыццёва неабходныя ў Навасёлках, станцыі Ашмяны, Кракоўцы. Сітуацыя ў апошняй непакоіць нас найбольш. Плануецца, што ў наступным годзе тут будзе пабудавана станцыя абезжалезвання (на гэта патрэбна прыкладна 200 тысяч рублёў). Ужо распрацаваны праект, — расказаў **Вадзім ПАШКОЎСКІ, намеснік старшыні Ашмянскага райвыканкама.** — На жаль, бюджэтных сродкаў райвыканкаму, як правіла, хапае толькі на замену камунікацый па адной вуліцы пасёлка, і мы стараемся мяняць іх менавіта ў аграгарадках, бо тут найбольш складаная сітуацыя.

Забруджванне вады на Ашмяншчыне адбываецца, па-першае, праз саму падземную крыніцу, у якой колькасць жалеза перавышае норму амаль у два разы: замест 0,3 мг/дм³ тутэйшы паказчык — 0,32—0,76, а колер вады — рыжы. Мясцовыя жыхары кажуць, што калі кран не закрыць шчыльна, то праз некалькі гадзін на ўмывальніку з'явяцца ржавыя палосы. Па-другое, вада дадаткова пагаршаецца, пакуль цячэ па старых трубах.

стар. 8

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

СХОВІШЧА КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

Члены верхняй палаты парламента павіншавалі Нацыянальную бібліятэку з юбілеем

У мінулыя сераду і чацвер старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл Мясніковіч, яго намеснік, віцэ-спікер верхняй палаты беларускага парламента Мар'яна Шчоткіна, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рахманаў прынялі ўдзел у мерапрыемствах, прысвечаных 95-годдзю Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (НББ) і 500-годдзю беларускага кнігадрукавання.

Ад імя Савета Рэспублікі члены Прэзідыума перадалі ўдзельнікам святочных мерапрыемстваў віншаванні і пажаданні. Міхаіл Мясніковіч уручыў ганаровыя граматы Нацыянальнага сходу заслужаным работнікам Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

У сваю чаргу, віншуючы супрацоўнікаў НББ з 95-годдзем, намеснік старшыні Савета Рэспублікі адзначыла, што бібліятэка з'яўляецца галоўным сховішчам культурнай спадчыны беларусаў. «Кніга мае важнае значэнне для беларускага народа. Яна захоўвае мудрасць пакаленняў, аб'ядноўвае нас як нацыю, з'яўляецца дасягненнем духоўнай культуры народа, — сказала Мар'яна Шчоткіна. — Сёння вялікая справа першадрукара Францыска Скарыны працягваецца на належным узроўні. На міжнародных кніжных выстаўках і конкурсах беларуская кніга прадстаўлена годна і атрымлівае высокія ўзнагароды».

ПЫТАННІ ПРАМЫСЛОЎЦАЎ І ПРАДПРЫМАЛЬНІКАЎ

Члены Прэзідыума Савета Рэспублікі ўзялі ўдзел у асамблеі

Старшыні пастаянных камісій Савета Рэспублікі — па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімір Панцюхоў, па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рахманаў — прынялі ўдзел у XI Справаздачна-выбарнай асамблеі Міжнароднага кангрэса прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў.

Мерапрыемства было арганізавана пры ўдзеле Беларускай навукова-прамысловай асацыяцыі і сабрала прадстаўнікоў дзелавых колаў больш чым з 30 краін, сярод якіх Італія, Германія, Венгрыя...

У гэты ж дзень, 15 верасня, Уладзімір Панцюхоў як член апякунскага (назіральнага) савета Беларускай федэрацыі валейбола ўдзельнічаў у пасяджэнні прэзідыума і пазачарговай справаздачна-выбарнай канферэнцыі федэрацыі, якія праходзілі на базе Універсітэта грамадзянскай абароны МНС Рэспублікі Беларусь.

НЕ ТОЛЬКІ ВЫСЛУХАЦЬ

Сенатары правялі асабістыя прыёмы грамадзян

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, дырэктар сярэдняй школы №16 г. Мазыра Аксана Кавалькова правяла асабісты прыём грамадзян.

У мінулую сераду адбылася сустрэча парламентарыя з жыхарамі Мазыра і Мазырскага раёна. Заяўнікаў хвалявалі пытанні працаўладкавання, пенсійнага забеспячэння і іншыя. А 11 верасня парламентарый правяла выязны асабісты прыём грамадзян Петрыкаўскага раёна, дзе былі ўзняты пытанні транспартных зносін аддаленых населеных пунктаў з раённым цэнтрам, медыцынскага абслугоўвання, працаўладкавання. Аксана Кавалькова дала тлумачэнні заяўнікам, а вырашэнне праблем, якія патрабуюць дадатковага вывучэння, узяла на кантроль.

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, галоўны ўрач Глускай цэнтральнай раённай бальніцы імя А.С. Сямёнава Ірына Пятрова правяла асабісты прыём грамадзян у Каткаўскім сельвыканкаме. Заяўнікамі былі ўзняты пытанні аказання банкаўскіх і паштовых паслуг, а таксама газазабеспячэння.

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

НАД ЧЫМ ПРАЦУЕМ

ЗАКОНАПРАЕКТЫ ПРЫВЯДУЦЬ У АДПАВЕДНАСЦЬ

Ужо праз два тыдні ў парламенце распачнецца чарговая сесія. Сярод законапраектаў, якія плануецца разгледзець, будуць і тыя, што закліканы палепшыць эканамічную сферу нашай краіны. Менавіта пра іх нам расказаў Уладзімір ПАНЦЮХОЎ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па эканоміцы, бюджэце і фінансах.

— Уладзімір Іванавіч, якія законапраекты, што адносяцца да кампетэнцыі Пастаяннай камісіі, плануецца разгледзець падчас восеньскай сесіі?

— На сённяшні дзень у Пастаяннай камісіі знаходзіцца шэсць прынятых у першым чытанні законапраектаў, якія мы рыхтуемся разгледзець. Сярод іх — новыя рэдакцыі законаў «Аб дзяржаўных закупках тавараў (работ, паслуг)» і «Аб супрацьдзеянні манапалістычнай дзейнасці і развіцці канкурэнцыі», законапраекты аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у законы аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве, аб абароне правоў спажыўцоў і інш. Акрамя гэтага, у абавязковым парадку будзе разгледжаны бюджэтны пакет.

У мінулы панядзелак пад кіраўніцтвам старшыні Савета Рэспублікі Міхаіла Мясніковіча адбылося пасяджэнне Прэзідыума Савета Рэспублікі, падчас якога абмяркоўваліся гэтыя і іншыя законапраекты, якія адносяцца да распараджэння Пастаяннай камісіі. Па кожным з іх выпрацаваны прапановы, накіраваныя на ўдасканаленне дзейнага заканадаўства ў той ці іншай сферы.

Члены Прэзідыума таксама звярнулі ўвагу на неабходнасць прывядзення разгледжаных законапраектаў у адпаведнасць з Дагаворам аб Еўразійскім эканамічным саюзе і правам ЕАЭС. Усё гэта будзе ўлічана намі пры дапрацоўцы.

— Якія законапраекты выклікалі найбольшую цікавасць у членаў Прэзідыума?

— Асаблівая ўвага была ўдзелена новым рэдакцыям законаў «Аб дзяржаўных закупках тавараў (работ, паслуг)» і «Аб супрацьдзеянні манапалістычнай дзейнасці і развіцці канкурэнцыі». Актыўная дыскусія разгарнулася вакол крытэрыяў і абгрунтавання парогавых значэнняў для прыняцця рашэнняў аб аднясенні суб'ектаў гаспадарання да суб'ектаў, якія займаюць дамінуючае становішча на рынку, і магчымасці ўдзелу мясцовых Саветаў дэпутатаў у прыняцці гэтых рашэнняў.

— Што да дзяржаўных закупак, якія карэктывы ў законапраект аб іх плануецца ўнесці?

— Асноўная мэта распрацоўкі гэтага законапраекта — прывядзенне нормаў дзейнага закона аб дзяржзакупках у адпаведнасць з Дагаворам аб ЕАЭС. Члены Пастаяннай камісіі, вывучыўшы прыняты ў першым чытанні законапраект, унеслі прапанову замацаваць у ім нормы, накіраваныя на стварэнне роўных умоў доступу суб'ектаў гаспадарання да дзяржаўных закупак на рынках Саюзнай дзяржавы і ЕАЭС, рэалізацыю механізма спецыяльных інвестыцыйных кантрактаў. Акрамя гэтага, прапанавалі замацаваць магчымасць свабоднага доступу ўдзельнікаў закупак да інфармацыі аб выніках праведзеных працэдур закупак і адказнасць удзельніка-пераможцы за дакладнасць звестак, пададзеных у дакументах, прадстаўленых для ўдзелу ў дзяржаўных закупках, а таксама за ўхіленне або адмову ад заключэння дагавора на дзяржаўную закупку.

— Якім чынам унясенне зменаў у Закон «Аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве» паўплывае на рэалізацыю гэтай формы ўзаемадзеяння паміж бізнесам і дзяржаўнымі структурамі?

— Прыняты ў 2015 годзе закон «Аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве» заклаў прававую аснову для пашырэння ўзаемадзеяння дзяржавы і бізнесу пры рэалізацыі розных праектаў. Праз пэўны час спатрэбілася яго дапрацаваць. Асноўныя змены закранулі парадак выбару прыватнага партнёра, падыходы да правядзення конкурсу і дзейнасці конкурснай камісіі па выбары прыватнага партнёра, паўнамоцтвы дзяржаўных органаў у сферы ДПП, склад удзельнікаў, якія могуць выступаць у якасці прыватнага партнёра, кантроль за выкананнем умоў пагаднення ДПП, а таксама гарантыі правоў прыватнага партнёра.

У той жа час мы выступілі з прапановай яшчэ больш удасканаліць дадзены інстытут і прадугледзець у законапраекце наяўнасць дзейснага механізма рэалізацыі праектаў дзяржаўна-прыватнага партнёрства, замацаванне зоны адказнасці дзяржаўных органаў і службовых асоб, адказных за прыняцце рашэнняў у сферы дзяржаўна-прыватнага партнёрства, уключэнне пераважна нормаў прамога дзеяння. Усё гэта дазволіць, на нашу думку, стварыць узаемавыгадныя і празрыстыя ўмовы дзейнасці дзяржаўных і прыватных партнёраў, а таксама дадаткова прыцягнуць інвестыцыі ў эканоміку краіны і вызваліць сродкі дзяржаўнага бюджэту.

Карыстаючыся нагодай, Уладзімір Панцюхоў павіншаваў калектыў рэдакцыі газеты «Звязда» з юбілейнай датай — стагоддзем — і пажадаў ёй далейшага росквіту, стабільнасці і фінансавага дабрабыту, а творчай камандзе — шчасця, моцнага здароўя, добрага настрою, цікавай працы, прафесійных поспехаў і ўдзячных чытачоў.

Вераніка ПУСТАВІТ.
pustavit@zviazda.by

Новая прапанова

Член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па эканамічнай палітыцы Ганна КАНАПАЦКАЯ сустрэлася з журналістамі, каб расказаць пра ініцыятывы, якія прапануюцца ў дачыненні да палітыкі па барацьбе з утрыманствам.

Асноўныя ідэі заключаюцца ў пераходзе на адрасную дапамогу тым, хто ў ёй мае патрэбу, фінансаванні пачатковай і сярэдняй адукацыі праз ваўчары і стварэнні інстытута індывідуальнага медыцынскага страхавання. Акрамя гэтага, прапановы закранаюць скарачэнне выдаткаў на падтрымку нерэнтабельных прадпрыемстваў і развіццё самазанятасці. Па словах Ганны Канапацкай, азнаёміцца з дакументам і паўдзельнічаць у абмеркаванні можна праз інтэрнэт.

Па-першае, на думку аўтараў ініцыятывы, адрасная грашовая сацыяльная падтрымка павінна фарміравацца на аснове дабрабыту кожнай сям'і. Зараз, напрыклад, камунальныя паслугі даціруюцца ўсім. Але ёсць людзі, якія сапраўды сёння могуць плаціць 100% за ваду, электрычнасць і г.д., а ёсць, напрыклад, людзі з абмежаванымі магчымасцямі, якім цяжэй здабыць гэтую суму. Увядзенне адраснай сацыяльнай падтрымкі дазволіць не размываць сродкі дзяржаўнага бюджэту на льготы і датацыі ўсім, а вызначыць тое кола асоб, якім яны сапраўды неабходныя. «У распрацоўцы ў нас цяпер знаходзіцца закон аб адраснай сацыяльнай фінансавай дапамозе грамадзянам Рэспублікі Беларусь», — дадала Ганна Канапацкая.

Па-другое, фінансаванне пачатковай і сярэдняй адукацыі з дапамогай ваўчараў. Гэта значыць рэалізацыя прынцыпу, калі грошы ідуць непасрэдна за вучнем. Гэты ваўчар таксама можа быць выкарыстаны на перападрыхтоўку працоўных кадраў, што важна, калі змяняецца рынак працы. Каб гэта сістэма запрацавала, роўныя ўмовы павінны быць як у дзяржаўных, так і ў прыватных установ адукацыі.

Па-трэцяе, увядзенне інстытута індывідуальнага медыцынскага страхавання праз адкрыццё кожнаму грамадзяніну страхавога медыцынскага назапашвальнага рахунку. Пры гэтым дзяржава нароўні з грамадзянамі ажыццяўляе салідарнае фінансаванне дадзенага страхавання.

Безумоўна, усё гэта немагчыма без пэўных эканамічных рэформаў. І ў тым ліку праз стымуляванне занятасці і стварэнне спрыяльнага дзелавога клімату, а таксама барацьбу з нерэнтабельнымі прадпрыемствамі, якія падтрымліваюцца за кошт дзяржаўных сродкаў. З гэтай мэтай, напрыклад, прапануецца правесці аўдыт дзяржпраграм, каб грошы адпраўляліся толькі туды, дзе яны сапраўды неабходныя. «Безумоўна, мы павінны стварыць умовы для інтэграцыі самых сучасных тэхналогій для таго, каб у Беларусі выраблялiся высокатэхналагічныя тавары і паслугі», — адзначыла Ганна Канапацкая.

Надзея АНІСОВІЧ.
anisovich@zviazda.by

СЕСІЯ

КАБ ДАЖЫЛІ ДА 100 ГАДОЎ

ПАПЯРЭДЖАННЕ гібелі і траўматызму пры ўзнікненні пажараў і іншых надзвычайных сітуацый абмеркавалі дэпутаты Віцебскага абласнога Савета. На сесіі былі агучаны і іншыя праблемы.

Напрыклад, у глыбінцы не хапае прафесіяналаў па рамонце печаў. А многія вяскоўцы не ведаюць, у якія арганізацыі трэба звяртацца для гэтага. А як пажылому чалавеку залезці на дах, каб прачысціць комін? Многія грамадзяне ў паважаным узросце таксама забываюць мяняць батарэйкі ў пажарных апавяшчальніках. Па-ранейшаму праблемай застаюцца спальванне травы, развядзенне вогнішчаў у забароненых месцах.

Маланаселенасць і аддаленасць

Вядома, што Віцебшчына — лідар у краіне па колькасці населеных пунктаў: іх больш за 6,2 тысячы. У тым ліку каля 600, на жаль, ужо без насельніцтва. А ў 1,5 тысячы жывуць да 5 чалавек. І каля 3 тысяч вёсак знаходзяцца параўнальна далёка ад месцаў дыслакацыі ратавальнікаў (больш за 10 кіламетраў). Усё гэта ўскладняе сітуацыю.

У віцебскім Цэнтры бяспекі.

Але ж калі ў вёсачцы нават адзін жыхар, там вядзецца прафілактычная работа. У першую чаргу за гэта адказвае сельвыканкам.

Аляксандр КЛАБУК, начальнік Віцебскага абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, канстатаваў, што, паводле апошняй інфармацыі, 58 чалавек загінулі сёлета пры пажарах. Большасць з іх знаходзіліся ў нецвярозым стане, 63% ахвяр — вяскоўцы.

Напярэдадні пахаладання па традыцыі актывізуецца прафілактычная работа мясцовых органаў улады. І тое, што яна праводзіцца не для справаздачы, пацвярджаецца статыстыкай. У прыватнасці, за апошнія 7 гадоў колькасць пажараў скарацілася ўдвая, а колькасць тых, хто загінуў, зменшылася ў 3 разы.

Вопыт для пераймання

Усё больш крэатыўна ў раёнах падыходзяць да пытанняў прафілактыкі.

Напрыклад, у Верхнядзвінскім раёне бізнес-лэдзі арганізуе пазнавальныя мерапрыемствы для дзятвы. А на Лёзненшчыне на ўзроўні старшыні райвыканкама даюцца канкрэтныя ўказанні: якія недахопы, хто і калі павінен выправіць. Адпаведныя звесткі даюцца пажарнымі. Там жа, дзякуючы гранту прадстаўніцтва ЕС/ААН, стварылі тэматычныя гульнявыя пляцоўкі для дзяцей.

У Віцебску сёлета адкрылі Цэнтр бяспекі. Першы ў краіне быў створаны на Гомельшчыне. Там, дарэчы, перад пачаткам сесіі пабывалі народныя выбраннікі.

Работнікі МНС ва ўстанове выкарыстоўваюць інтэрактыўныя формы работы. І ў першую чаргу з дзецьмі. Але і дарослым павучыцца ёсць чаму. Сярод іншага створаны квэст-пакой, у якім можна праверыць свае веды па бяспецы, выканаўшы прапанаваныя заданні. Памяшканні абсталяваны з выкарыстаннем высокатэхналагічных адукацыйных трэнажораў. З дапамогай так званай дапоўненай рэальнасці тут можна вывучыць прычыны пажараў, навучыцца эвакуіравацца праз задымлены лабірынт. А пры дапамозе вогнетушыцеляў-сімулятараў навучаць ліквідаваць узгаранне. Ёсць нават магчымасць адчуць сябе ў сітуацыі, калі правальваешся пад лёд. Пакой віртуальнай рэальнасці дапаможа паглыбіцца і ў розныя іншыя надзвычайныя сітуацыі і навучыцца выходзіць з іх.

Старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ заклікаў прысутных арганізаваць наведванне гэтай установы для дзяцей з глыбінкі. І падтрымаў ідэю зрабіць аналагічны, хай не такі высокатэхналагічны, цэнтр у Наваполацку.

На думку дэпутатаў, работа па прафілактыцы надзвычайных здарэнняў павінна праводзіцца рэгулярна і сістэмна. Каб грамадзяне разумелі, што нават з-за бытавой дробязі можна пазбавіцца здароўя і жыцця.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

ГІРАВІКІ ПАКАЗАЛІ КЛАС

Сярод удзельнікаў III Сусветнай алімпіяды па гіравым трыятлоне быў і старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСТНЁЎ

У Віцебску ў канцы мінулага тыдня сваё майстэрства паказалі больш за 300 гіравікоў амаль з 30 краін свету. Ініцыятарам правядзення спаборніцтваў стаў прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі гіравых відаў спорту Анатоль Яжоў, уладальнік больш чым 250 «гінесаўскіх» сертыфікатаў.

Фота Аляксея СПАТКАЯ.

Гіравікі беларускай каманды, у цэнтры — губернатар Мікалай ШАРСТНЁЎ.

Упершыню падчас алімпіяды быў разыграны Кубак губернатара. Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Шарстнёў, дарэчы, займаецца гіравым спортам. І асабіста паказаў «вышэйшы пілатаж» — у складзе беларускай каманды падчас эстафеты за хвіліну 61 раз падняў 32-кілаграмовую гіру. Гіравікі, з якімі ён выступіў, занялі першае месца, а губернатар атрымаў пасведчанне майстра спорту міжнароднага класа.

У рамках алімпіяды была зроблена спроба паставіць калектыўны рэкорд Гінеса — каля 1100 чалавек на тэрыторыі школы (СШ №46) у «спальным раёне» Білева на працягу 15 секундаў скакалі на адной назе. Гэта рабілі школьнікі, іх бацькі, а таксама выкладчыкі. Пасля таго як у штаб-кватэры Кнігі рэкордаў Гінеса зацвердзяць вынік, ён афіцыйна ўвойдзе ў летапіс сусветных дасягненняў. Да гэтага ў казахстанскім горадзе Петрапаўлаўску адначасова скакалі «ўсяго» 800 чалавек.

Як растлумачылі арганізатары, скачкі на расслабленне — частка фізічнай падрыхтоўкі гіравікоў. Таму лагічна, што менавіта гэта практыкаванне было выбрана для ўсталявання рэкорду.

Аляксандр ПУКШАНСКІ. *pukshanski@zviazda.by*

ЗВАРОТ У РЭДАКЦЫЮ

НЕ ГАРАЦЬ ЛІХТАРЫ? Звяртайцеся ў сельвыканкам

У «Мясцовае самакіраванне» звярнуўся жыхар Мінска. «Нядаўна збылася даўняя мара нашай сям'і: купілі домік пад лецішча ў адной з вёсак Валожынскага раёна. Але ў населеным пункце позна вечарам не гараць ліхтары вулічнага асвятлення», — паскардзіўся мужчына.

Вядома, для гарадскога жыхара сельскае жыццё мае ў нечым перавагі ў параўнанні з гарадскім: чыстае паветра, прырода, цішыня і спакой. Але разам з тым гараджане хочуць, каб у вёсцы ўсё было як у мегаполісе, дзе кожны вечар запальваюцца агні і гараць да самай раніцы, пакуль не развіднее, дзе падсвечваюцца адміністрацыйныя будынкі, аб'екты культурнага і забаўляльнага прызначэння. У вёсцы, бясспрэчна, свая спецыфіка і свае стандарты.

— Безумоўна, сталіца — гэта візітная картка краіны, таму там наладжана добрае асвятленне. А ў маленькіх вёсачках на лета, калі цямнее позна, мы абмяжоўваем час асвятлення. Ды і жывуць тут у асноўным пажылыя людзі, пенсіянеры, якія прывыклі рана лажыцца спаць, — растлумачыў **начальнік аддзела жыллёва-камунальнай гаспадаркі Валожынскага райвыканкама Анатоль АЛІЕЎ.** — Краіна купляе электраэнергію ў суседняй Расіі за валюту. Каб разлічыцца за пастаўкі, яе спачатку трэба зарабіць. У выніку высокіх тарыфаў і недахопу сродкаў эканоміць вымушаны не толькі мы. Здараецца, што зрабіць паўнавартаснае асвятленне немагчыма і па тэхнічных прычынах. Гэта датычыцца перш за ўсё маланаселеных вёсак. На доўгіх вуліцах, як правіла, ліхтары гараць у пачатку і ў канцы.

Як запэўніў Анатоль Аліеў, з кастрычніка будзе наладжана асвятленне ўсюды. Цяпер электрыку не трэба прыязджаць, каб «запаліць» ліхтары. Ставіцца рэле, якое працуе ў аўтаматычным рэжыме: цямнее — уключаецца электрычнасць, на світанні — выключаецца.

Вядома, на аплату вулічнага асвятлення патрабуюцца значныя сродкі. Іх можна было б выкарыстаць на добраўпарадкаванне. «Але ж і пакінуць сельскіх жыхароў зімой без святла таксама нельга. Нават там, дзе пражывае ўсяго некалькі чалавек», — упэўнены мой суразмоўнік.

Мабыць, кожны з нас памятае 90-я гады мінулага стагоддзя, калі па вечарах у цемень пагружаліся не толькі малыя вёсачкі, але і буйныя населеныя пункты. Проста на гэтыя мэты не прадугледжвалася сродкаў у раённых бюджэтах. З прыняццем Закона «Аб дзяржаўных мінімальных сацыяльных стандартах» сітуацыя змянілася.

Вонкавае асвятленне гарадоў, пасёлкаў і сельскіх населеных пунктаў рэгламентуецца тэхнічным кодэксам «Натуральнае і штучнае асвятленне. Будаўнічыя нормы праектавання» (ТКП 45-2.04-153-2009 (02250)) і пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб мерах па ўкараненні сістэмы дзяржаўных сацыяльных стандартаў па абслугоўванні насельніцтва рэспублікі» ад 30 мая 2003 года №724.

Паводле прапісаных стандартаў, асвятляцца павінна не менш як 80% плошчы ўсёй вёскі. Калі населены пункт невялікі, то на адной вуліцы ўстанаўліваецца не менш за два ліхтары.

Для зусім маленькіх вёсак прадугледжаны толькі два ліхтары — на ўездзе і на выездзе. У аграгарадках павінны асвятляцца не толькі самі вуліцы, але і тэрыторыя каля ўстаноў культуры, адукацыі, адміністрацыі. Аднак гэтае правіла не заўсёды цалкам выконваецца.

Адказнасць па забеспячэнні і абслугоўванні вулічнага асвятлення ўскладзена на мясцовыя сельвыканкамы. Тэхнічныя пытанні, замена абсталявання, эксплуатацыя — у кампетэнцыі мясцовых раённых электрычных сетак, а рамонтныя работы аплачваюцца мясцовай адміністрацыяй або арганізацыяй, ва ўласнасці якой знаходзяцца сельскія камунікацыі. У выпадку, калі ўзнікаюць нейкія пытанні па рабоце вулічнага асвятлення, жыхары павінны звяртацца ў сельвыканкам, на тэрыторыі якога знаходзіцца населены пункт. Заяўкі рэгіструюцца і накіроўваюцца ў раённыя электрасеткі.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.
lazovskaya@zviazda.by

МЕРКАВАННІ

Якія надзеі ўскладаліся на аграгарадкі і што атрымалася ў выніку?

Такое пытанне мы задалі кіраўнікам сельсаветаў.

Старшыня Крамяніцкага сельскага Савета дэпутатаў Зэльвенскага раёна Аляксандр ДЗЕРАЧЭНІК:

— Найперш аднавіўся знешні выгляд адпаведнага населенага пункта: грашовыя сродкі пайшлі на рамонт школы, амбулаторыі, Дома быту, пошты. Трэба сказаць, што рэалізацыя праекта па аграгарадку супала з будаўніцтвам жылля, якое распачала мясцовая гаспадарка. З'явіўся цэлы «мікрараён» новабудоўляў, прычым па некаторых параметрах яны аказаліся больш выгаднымі, чым гарадскія кватэры. Усё гэта дапамагло аграгарадку Князева стаць цэнтрам актыўнасці сельсавета. Тут пражывае пятая частка нашага насельніцтва, прычым трэць складаюць моладзь і дзеці.

Па маіх назіраннях, будаўніцтва і газіфікацыя зрабілі нашы мясціны прыцягальнымі. У той час як іншыя вёскі старэюць, тут людзі застаюцца з сем'ямі. Адзінае, што хацелася б дадаць сюды, — гэта новыя перапрацоўчыя прадпрыемствы. Пакуль што ў моладзі абмежаваны выбар месцаў працы. Не кожны хоча станавіцца жывёлаводам ці механізатарам, нават з прыстойным заробкам. Калі б у гэтым плане быў выбар, маладыя часцей вярталіся б на радзіму пасля вучобы.

Старшыня Пяршайскага сельскага Савета дэпутатаў Валожынскага раёна Валянціна КУШАЛЬ:

— Будаўніцтва аграгарадка дало нам магчымасць правесці капітальны рамонт ключавых будынкаў, зрабіць дарожкі для пешаходаў, пабудаваць кафетэрый...

Пабудавана 44 адзінкі жылля. Яшчэ пяць аб'ектаў «замарожана», бо фінансаванне спынілася, а скончыць работы ўласнымі сіламі мясцовая гаспадарка не мае магчымасці. Увогуле, многія хацелі б жыць у аграгарадку толькі з-за інфраструктуры. Аднак ёсць і цяжкасці. Напрыклад, планавалася, што аддзяленне банка будзе працаваць тут штодзённа. Насамрэч установа адчынена толькі два разы на тыдзень. Работнікі банка запэўніваюць, што так людзі стануць ахвотней карыстацца карткамі. Але ж для поўнага пераходу на безнаяўны разлік аграгарадок не мае патрэбнай інфраструктуры. Няма банкамата, тэрміналаў, так што ўсе выплаты трэба па старым звычаі рабіць на пошце. Акрамя таго, населены пункт знаходзіцца непадалёк ад буйной аўтатрасы. Натуральна, што людзі спыняюцца, каб абмяняць «замежныя» грошы на беларускія рублі. Толькі зрабіць гэта немагчыма. Атрымліваецца, тэрыторыя губляе патэнцыйны прыбытак. Што датычыцца развіцця, то тут кірунак падказваюць самі жыхары. Так, сельсавет разглядае магчымасці для будаўніцтва невялікага кірмашу, дзе б можна было набыць гаспадарчыя дробязі.

Старшыня Дварышчанскага сельскага Савета дэпутатаў Лідскага раёна Іван ГАНЕВІЧ:

— Наш аграгарадок знаходзіцца ў даволі знакавай гістарычнай мясціне. Гэта добры турыстычны патэнцыял. Каб развіваць яго, патрэбны рамонт аддзялення коннага спорту. Такім чынам мясцовасць займела б манеж і гасцініцу. Яшчэ адна патрэба — пункт грамадскага харчавання. У аграгарадку дзейнічае «саўгасная» сталовая, але там абедаюць толькі работнікі мясцовай гаспадаркі. У нас жа па сельсавеце каля 600 чалавек моладзі, і ім хочацца сабрацца вечарам ва ўтульным кафэ, паслухаць музыку, выпіць кавы. Ну а самая вялікая мара на наступныя гады — аднавіць будаўніцтва дамоў, якое спынілася каля 8 гадоў таму. У сельсавеце добрая дэмаграфічная сітуацыя, а пустых кватэр няма. Ільготнае жыллё прыйшлося б дарэчы — у чарзе на паляпшэнне ўмоў знаходзяцца 18 сем'яў. Два дамкі за год — ужо была б вялікая палёгка, але гаспадарка не пацягне такую нагрузку фінансава. Шкада, што дзяржаўная падтрымка праектаў прыпынілася.

Старшыня Маланемкаўскага сельскага Савета дэпутатаў Веткаўскага раёна Аліна ПРЫВАЛАВА:

— Аграгарадок прынёс жыхарам выгоды ў выглядзе заасфальтаваных вуліц, новых агароджаў і падноўленых і новых будынкаў... Праўда, дзесьці «згубілася» газіфікацыя, трубу рабочыя дацягнулі толькі да бальніцы, але не да жылых дамоў...

Але для людзей не столькі важна, што будзе пабудавана за дзяржаўныя сродкі, колькі магчымасць рэалізаваць сябе і адчуць вынік сваёй працы. Абсталяваць магазін, наладзіць транспартнае забеспячэнне, тэлефонную сувязь — усе гэтыя меры патрэбныя, і яны далі свой плён. Навошта вяскоўцу ехаць у горад, калі ён ужо мае выгоды для жыцця? Адзінае, што адштурхоўвае чалавека — гэта зніжаная ацэнка яго працы. Калі гаспадар рупіцца для сям'і, якасна выконвае даручэнні, яму трэба даць магчымасць дастойнай аплаты, а не прапаноўваць мінімальны заробак.

Рагнеда ЮРГЕЛЬ. *yurgel@zviazda.by*

ГОРАД У СЕЛЬСКАЙ МЯСЦОВАСЦІ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Дзве асноўныя праблемы

Сельская гаспадарка для нашай краіны заўсёды была адным з найбольш прыярытэтных напрамкаў эканамічнага развіцця. Мы практычна поўнасцю забяспечваем сябе прадуктамі харчавання і імпартуем менш за 10% ад усяго аб'ёму прадукцыі. У Беларусі сканцэнтравана 23,4% сусветных пасеваў лёну — сярод 23 вядучых вытворцаў ільновалакна краіна ўваходзіць у першую пяцёрку. Вырошчванне сельскагаспадарчай прадукцыі на душу насельніцтва адпавядае ўзроўню развітых краін і па такіх пазіцыях, як вытворчасць бульбы, цукровых буракоў, мяса, а па малаку перавышае паказчыкі, дасягнутыя ў краінах СНД. У сусветнай вытворчасці малака Беларусь займае сёмую пазіцыю, саступаючы краінам ЕС, ЗША, Індыі, Новай Зеландыі, Аргентыне, Аўстраліі. Дзякуючы гэтаму мы ўваходзім у пяцёрку найбуйнейшых сусветных экспарцёраў малочнай прадукцыі. Таксама ўваходзім у 20 краін-лідараў па экспарце мяса. Але варта заўважыць, што ўсяго пералічанага дасягнуць за год-два немагчыма. Да гэтага ў краіне рыхтаваліся не адну пяцігодку. Былі напісаныя дзясяткі дакументаў, праведзена вялікая работа па стварэнні дзяржпраграм, якія літаральна рэанімавалі сельскую гаспадарку ў пачатку 90-х.

> «Але нягледзячы на тэхнічныя магчымасці дзяржавы ў сферы АПК, спрыяльны клімат, глебу, навуковыя распрацоўкі, не варта забываць, што ў першую чаргу ў полі ўсё яшчэ працуюць кваліфікаваныя спецыялісты», — лічыць Дзмітрый Гобараў.

З'яўляючыся практыкам, які працаваў у сельскай гаспадарцы ў часы СССР і пасля яго распаду, ён прайшоў усе стадыі фарміравання АПК краіны і ведае многія яго болевыя кропкі. «Калі я выступаў са справаздачамі па праведзенай рабоце перад кіраўніцтвам, заўсёды адзначаў, што перад спецыялістамі ёсць дзве праблемы: дастойная аплата працы і арганізацыя жыцця. Далёка не ўсе могуць працаваць у гэтай сферы. Далёка не ўсе хочуць «бітвы за ўраджай». Ведаючы і разумеючы гэта, дзяржава ставіць перад сабой важную задачу — стымуляваць стварэнне ўмоў для спецыялістаў сельскай гаспадаркі, каб яны адчувалі сваю запатрабаванасць», — кажа Дзмітрый Гобараў.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Барацьба за супрацоўнікаў

З гэтай мэтай і былі створаны дзяржпраграмы па адраджэнні і развіцці вёскі на 2005—2010 гады, а таксама па ўстойлівым яе развіцці на 2011—2015 гады. Яны добра паўплывалі на рашэнне харчовай праблемы і дазволілі істотна павысіць узровень самазабеспячэння нашай краіны асноўнымі відамі сельскагаспадарчых і харчовых тавараў, а таксама сфарміравалі экспартны патэнцыял. Акрамя таго, згодна з дзяржпраграмай па адраджэнні сяла буйным населеным пунктам прысвоілі статус аграгарадкоў і інвеставалі ў стварэнне на іх тэрыторыі ўсёй неабходнай для жыцця людзей інфраструктуры, якая не саступала б гарадскім умовам. За пяць гадоў пад паняццем «аграгарадок» пачалі разумець добраўпарадкаваны населены пункт, у якім створаны вытворчая і сацыяльная інфраструктуры для забеспячэння сацыяльных стандартаў па абслугоўванні насельніцтва і жыхароў прылеглых тэрыторый. Сёння ў краіне больш за 1500 такіх паселішчаў.

«Дзяржпраграма дазволіла стварыць або адрэстаўраваць у буйных населеных пунктах усёй краіны школы, бальніцы, спартыўныя аб'екты, арганізаваць культурны вольны час, правесці водазабеспячэнне, пабудаваць дарогі. Зрабіць гэта стараліся раўнамерна па ўсіх рэгіёнах», — тлумачыць дэпутат. Калі зірнуць на праграму па ўстойлівым развіцці вёскі, то ў ёй ужо стаяла задача паляпшэння створаных аграгарадкоў. У прыярытэце была работа па напаўненні іх неабходнымі аб'ектамі інжынернай інфраструктуры і развіццём існуючых. Вядома, аб'ёмы фінансавання былі абмежаваныя. Не ўсюды зрабілі тое, што хацелася б. Разам з тым мы сёння маем дастаткова развітую інфраструктуру ў больш чым 1,5 тысячы аграгарадкоў. Вынікі такіх праграм ацаніць заўсёды цяжка — колькі людзей, столькі і меркаванняў. Аднак усё гэта зроблена не дарэмна. Можна сказаць, што атрымаўся такі стрымліваючы фактар для моладзі, каб яна не з'язджала ў горад, а магла асесці ў вёсцы і займацца сельскай гаспадаркай.

> «Колькасць і якасць спецыялістаў у сферы АПК сёння знікае. Гэтага нельга не ўбачыць. Дастаткова паглядзець на невысокі конкурс у аграпрамысловыя ВНУ краіны. Але каб зацікавіць і захаваць работнікаў у сферы, трэба ствараць для іх неабходныя ўмовы пражывання і працы», — упэўнены Дзмітрый Гобараў.

Кадравая бяспека

На думку нашага суразмоўніка, калі дэфіцыт рабочых рук яшчэ магчыма нівеліраваць за кошт аўтаматызацыі сферы, то якасць ведаў спецыялістаў — не. «Пры гэтым сельскую гаспадарку для краіны захаваць вельмі важна. Мы не здабываем неабходны аб'ём вуглевадародаў і не з'яўляемся турыстычнай мекай, не маем у прамысловых маштабах золата. Нашы перавагі сёння — гэта АПК і машынабудаванне. Ім трэба аддаваць асаблівую ўвагу. Страціць пазіцыі на сусветным рынку лёгка, вярнуць іх назад — вельмі складана», — выказаў сваё меркаванне дэпутат. Разважаючы аб кадравай бяспецы АПК, ён заўважыў, што Брэсцкая і Гродзенская вобласці сёння добра забяспечаны спецыялістамі. На Віцебшчыне і Магілёўшчыне, на яго думку, сітуацыя адваротная. Прычым калі ўлічыць умовы для пражывання і працы, то нельга сказаць, што ў Віцебскай вобласці яны горшыя, чым, скажам, у Гродзенскай. Усё цалкам залежыць ад гаспадарак. Ва ўсіх абласцях ёсць і моцныя, і слабыя арганізацыі. Але падтрымліваць іх вельмі важна.

> «Без датацый у АПК мы б сёння не мелі вынікаў па жніве больш чым у 7,5 млн тон збожжа. Але калі выпусціць з-пад увагі будучыню галіны, не ствараць умовы для маладых спецыялістаў, то можна шмат што страціць», — рэзюмаваў Дзмітрый Гобараў.

З некаторай упэўненасцю можна сказаць, што праблема з жыллём на вёсцы сёння вырашана. У многіх аграгарадках будавалі яго нават з запасам — для будучых спецыялістаў. А вось на пытанне зацікаўленасці працай у гэтай сферы яшчэ трэба будзе адказаць. Бо ад яго залежыць наша харчовая бяспека.

Ілья КРЫЖЭВІЧ.
kryzhevich@zviazda.by

МЕСЦА ЖЫХАРСТВА

ЗАДЗЕЙНІЧАЦЬ ФІНАНСЫ І МАГЧЫМАСЦІ

Добрыя ўстановы адукацыі як прыкмета паспяховага аграгарадка

ЗВЫЧАЙНА прыгожы, дагледжаны і паспяховы аграгарадок сустракаецца там, дзе ёсць сельгаспрадпрыемства-гігант. Яно, як правіла, не толькі забяспечвае вясковых людзей работай, але і шмат укладвае ў будаўніцтва, добраўпарадкаванне населенага пункта. На Брэстчыне такіх нямала, напрыклад Жамчужны альбо Мір у Баранавіцкім раёне, Астрамечава ў Брэсцкім, Белавежскі ў Камянецкім раёне. А вось Лінова на Пружаншчыне не прывязана да буйнога комплексу, але ўяўляе сабой прыклад аграгарадка, пра які можна сказаць, што ён адбыўся, жыве і развіваецца.

«Лінова і наваколле»

Ці часта вы чулі пра аграгарадкі, якія маюць свой сайт у сеціве? Калі ласка: linovo.by. А называецца ён «Лінова і наваколле». Стварыў уласны партал школьны настаўнік інфарматыкі Аляксандр Гук. З дапамогай вучняў і аднадумцаў Аляксандр Іванавіч піша хроніку жыцця сваіх мясцін.

На ўрачыстай лінейцы прысутнічалі ганаровыя госці.

І не толькі вясковыя падзеі, мерапрыемствы знаходзяць адлюстраванне на віртуальных старонках. Цэлыя раздзелы прысвечаны гісторыі, прадпрыемствам і ўстановам, якія працуюць у Лінове. А яшчэ сабралася вельмі цікавая падборка пра землякоў — выхадцаў з гэтага краю. Тут можна прачытаць пра герояў вайны і слынных працаўнікоў, пра цікавых людзей — такіх як былая савецкая разведчыца, а цяпер маскоўская пісьменніца Яўгенія Якута і паэт-пчаляр Мікола Папека, які заснаваў уласную мядовую прэмію ды адзначае ёю аўтараў за поспехі ў літаратуры.

Па сутнасці, сайт Аляксандра Гука стаў галоўным вясковым сродкам інфармацыі. Яго наведвальнікамі з'яўляюцца ўсе, хто мае інтэрнэт у доме, і шматлікія выхадцы з Лінова і наваколля. Пра будучыя мерапрыемствы, канцэрты шырокая вясковая грамадскасць інфармуецца найперш праз linovo.by.

Грант на культуру

Цікава, што ў Лінове вельмі добра развіваецца самадзейнасць, ёсць свае калектывы. А музычная школа стала своеасаблівым брэндам вёскі. Не жартачкі: тут займаецца 105 вучняў. Пры тым што ў агульнаадукацыйнай школе вучыцца 245 хлопчыкаў і дзяўчатак. Таленавітыя дзеці маюць магчымасць развіваць і ўдасканальваць свае здольнасці.

Зараз у музычнай школе працягваецца рамонт, чаму вельмі рады і выхаванцы, і бацькі, і педагогі. Сама школа размяшчаецца ў будынку Дома культуры. Ён быў узведзены на рубяжы 80—90-х гадоў з савецкім размахам. Цяпер утрымліваць яго вельмі дорага. Велізарныя вокны пачалі прапускаць холад і сталі сапраўднай праблемай.

— Вокны мяняюць на новыя, — маім экскурсаводам выступае **старшыня Ліноўскага сельскага Савета Таццяна МАРДАНЬ.** — Засталіся апошнія штрыхі, і дзеці вернуцца ў свае ранейшыя класы.

Ліноўцы выйгралі грант у рамках праекта «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь». Ініцыятыва іх называецца «Дом, у якім жыве культура», сродкі на яе фінансаванне выдзелены Еўрасаюзам па праграме развіцця ААН. Адсюль і новыя вокны не толькі ў музычнай школе, але і ў бібліятэцы. За гэтыя грошы ўдалося таксама ўцяпліць фасад бібліятэкі, у якой апошнім часам мерзлі і супрацоўнікі, і наведвальнікі, абсталяваць залу харэаграфіі, набыць чатыры сцэнічныя касцюмы. Бібліятэкары радуюцца, што традыцыйныя літаратурныя гасцёўні, якія сталі папулярнымі сярод людзей сталага ўзросту, можна будзе праводзіць нават зімой.

Аптымістычная статыстыка

У Лінове ўжо некалькі гадоў павялічваецца колькасць дзяцей да 18 гадоў, гэта значыць насельніцтва маладзее. Дырэктар мясцовай школы Алена Макарэвіч сказала, што педагогі пастаянна трымаюць у полі зроку пытанне нараджальнасці. Статыстыка ўсяляе аптымізм. Вучняў за наступную пяцігодку не паменшае. Шматдзетных сем'яў становіцца больш. А сёлетняе першае верасня стала асабліва святочным у Лінове. Тут уступіла ў строй новая прыбудова — корпус пачатковай школы з харчовым блокам. На ўрачыстай лінейцы прысутнічаў ганаровы госць — прэм'ер-міністр краіны Андрэй Кабякоў. Цяпер у школе расстаўляюць па кабінетах падарункі, а малодшыя школьнікі асвойваюць новыя ўтульныя прасторныя класы.

Вядома, для многіх сем'яў вырашальным фактарам пры выбары месца жыхарства становіцца наяўнасць добрай установы адукацыі. А тут якраз той выпадак.

Дзіцячы садок, які ўзвялі восем гадоў таму, таксама стаў адной з мясцовых славутасцяў. Відаць, найперш таму, што працуе тут калектыў аднадумцаў-энтузіястаў. Сваю ўстанову педагогі і супрацоўнікі ператварылі ў цэнтр адукацыі і культуры. Ёсць сапраўдны этнаграфічны музей — беларуская хата, майстэрня для юных умельцаў і шмат чаго іншага. Але асабліва цікавым мне падаўся куток прафарыентацыі, у якім любяць гуляць дзеці. Дарослыя стварылі для малых гульнявыя копіі прадпрыемстваў, якія працуюць на тэрыторыі. У некага бацькі заняты, напрыклад, на Аранчыцкай птушкафабрыцы. І вось вам цэлы канвеер з яйкамі, кураняткамі, курамі-нясушкамі.

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

У новым корпусе школы.

> Малыя сартуюць яйкі і перасяляюць куранят. Ферму прадстаўляюць выразаныя з фанеры каровы, якіх можна «лячыць», «даіць», «даглядаць». На хлебапрыёмным прадпрыемстве «правяраюць» якасць збожжа, а на пякарні «гатуюць» булачкі.

Выхаванцы садка гуляюць у аператараў хлебапрыёмнага прадпрыемства.

І выхаванцы старэйшых груп могуць расказаць пра асноўныя цыклы работы. «У гульнявой форме ўсё гэта вельмі добра ўспрымаецца дашкольнікамі, — гаворыць загадчыца садка Святлана Гардзіеўская. — Яны і дома потым шмат пытанняў задаюць бацькам пра іх работу. З гэтага і пачынаецца прафарыентацыя».

Сацыяльны аспект

Да аграгарадка Лінова з насельніцтвам у 1718 чалавек прымыкае вёска Аранчыцы з 825 жыхарамі і чыгуначнай станцыяй. Гэтую тэрыторыю абслугоўваюць восем гандлёвых пунктаў розных формаў уласнасці. Бытавыя паслугі аказвае комплексны прыёмны пункт. Каб абутак парамантаваць альбо зрабіць стрыжку, не трэба ехаць у горад. Аддзяленне банка працуе пяць дзён на тыдзень, плацежны тэрмінал ёсць і на пошце. Ёсць інфакіёск, але няма банкамата. Яго знаходжанне не банк палічыў нерэнтабельным, хоць людзі, несумненна, хацелі б мець і банкамат, які можна выкарыстаць нават у выхадныя дні.

Добрыя водгукі давялося чуць пра работу амбулаторыі. Тут прымае не толькі ўрач агульнай практыкі, ёсць свой стаматолаг, па графіку прыязджаюць спецыялісты.

Уладальнік сайта Аляксандр Гук як пастаянны жыхар Лінова хацеў бы, каб больш актыўна праводзіліся работы па добраўпарадкаванні. На яго думку, патрабуе рамонту стадыён. Бо, напрыклад, футбольная каманда «Лінова» нядаўна заваявала прызавое месца ў вобласці, у раёне яны сталі першымі. Колькасць аматараў футбола расце, а ўмовы для трэніровак вымушаюць жадаць лепшага.

— На жаль, пакуль не ўдаецца знайсці спонсара для гэтай справы, — гаворыць старшыня сельскага Савета. — Можа, з часам нешта ўдасца зрабіць. Назіраецца ажыўленне ў сферы прадпрымальніцтва. Вось і нядаўна зарэгістраванае новае прадпрыемства па вырабе матрацаў.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
yackevich@zviazda.by

Марыя СЦЕПАНЮК, старшыня Пружанскага раённага Савета дэпутатаў:

— У раёне зараз зарэгістравана 17 аграгарадкоў. За гады іх узвядзення асваенне інвестыцый склала (у цэнах да дэнамінацыі) амаль 240 мільярдаў рублёў. Крыху больш за палову гэтых грошай укладзена ў вытворчую сферу. Былі ўзведзены і рэканструяваны аб'екты раслінаводства і жывёлагадоўлі. А гэта — умовы працы і новыя рабочыя месцы для жыхароў вёскі.

За гэты ж час добраўпарадкавана 153 кіламетры вуліц і дарог у населеных пунктах, рэканструявана 82 кіламетры сетак электразабеспячэння і 51 кіламетр сетак водазабеспячэння, а таксама ўзведзены кіламетры новых інжынерных камунікацый, паявілася 7 новых артэзіянскіх свідравін, 1 новая станцыя абезжалезвання вады.

Пры будаўніцтве аграгарадкоў быў уведзены ў эксплуатацыю 91 аднакватэрны дом, адрамантаваны дзясяткі школ, магазінаў, дамоў культуры, аддзяленняў паштовай сувязі. Усё названае мае на ўвазе вялікія сродкі і вялікую работу. Цяпер стаіць задача ўсё падтрымліваць у належным стане ды ўдасканальваць. Што і робіцца па меры магчымасці. У тым жа Лінове сёлета праведзена пэўная работа па добраўпарадкаванні вуліц за сродкі раённага бюджэту. А мясцовая ініцыятыва паспрыяла паляпшэнню стану аб'ектаў культуры. Важна задзейнічаць усе магчымасці, прыцягваць розныя крыніцы фінансавання.

УЧОРА, СЁННЯ, ЗАЎТРА

ДОБРАЕ МЕСЦА ПУСТЫМ НЕ БЫВАЕ

ЖЫХАРЫ Дудзічаў даўно лічаць выгоды, якія прыйшлі са статусам аграгарадка, звычайнай справай.
І заўважаюць, што ў іх ёсць тое, чаго няма ў гараджан: чыстае паветра, блізкасць да прыроды і час, які рухаецца куды больш павольна, чым у мегаполісе.

Старшыня сельсавета Іна ЗМУШКА і дырэктар школы Вадзім КРЭК каля паклоннага крыжа, дзе некалі стаяла Троіцкая царква.

Шматдзетная мама Інга Змушка пераехала ў аграгарадок Дудзічы Калінкавіцкага раёна з іншай вёскі. Ужо тут стала працаваць пштальёнкай і нарадзіла траіх дзяцей. Сёння жанчына ў водпуску па доглядзе малодшага сына. Кажа, што Дудзічы ёй вельмі падабаюцца:

— Мужу выдзелілі дом ад мясцовага прадпрыемства «Дудзічы-Агра». Аўтобус ад нас да Калінкавіч ходзіць. Калі дзіця захварэла, звяртаюся ў мясцовы ФАП. Старэйшы сын пасля школы наведвае яшчэ і музычную, якая таксама побач. Клуб, пошта, крама — усё ў адным месцы. І ўвогуле — прыгожа ў нас, едзеш і любуешся.

Са старшынёй сельскага Савета Інай Змушкай мы аб'язджаем вялізны населены пункт і дзве бліжнія вёскі: Чырвоную Ніву і Муравейніцу. Між тым не заўважаю розніцы. Па-першае, таму што яны практычна прымыкаюць да аграгарадка. Па-другое, нідзе няма закінутых дамоў. Іна Леанідаўна сведчыць: як і ўсюды, здараецца, што гаспадары паміраюць і пабудовы застаюцца безнаглядамі. Але ж толькі на кароткі час. У сельсавеце робяць усё, каб нашчадкі паклапаціліся пра спадчыну — ці самі пачалі прыводзіць у парадак дом, ці прадалі іншым людзям.

За тыя 12 гадоў, якія прайшлі з моманту атрымання статусу аграгарадка, жыхары Дудзічаў прывыклі да выгод, якія атрымалі. Водазабеспячэнне, газазабеспячэнне — калі ласка. Усе, хто хацеў, маюць прыроднае блакітнае паліва ў дамах. Нават скрыні для асобнага збору смецця ўсталяваны. Да Калінкавіч рукой падаць. Мазыр таксама недалёка. Крама, пункт бытавога абслугоўвання, лазня, школа, дзіцячы садок, фельчарска-акушэрскі пункт... Усе аб'екты не новыя, але дагледжаныя звонку і знутры.

Да асваення грошай, выдзеленых па праграме адраджэння і развіцця вёскі на 2005—2015 гады, падышлі па-гаспадарску. Многія старыя пабудовы былі рэканструяваны і поўнасцю перабсталяваны. Вось і ў Дудзічах на месцы рабочай сталовай з'явілася дагледжаная кавярня, куды заходзяць перакусіць і свае, і тыя, хто праязджае па трасах на Мінск ці Светлагорск, якія праходзяць праз населены пункт. (Гатуюць смачна, магу пацвердзіць.)

Галоўная прыкмета, што вёска жыве, — наяўнасць дзяцей. У сельсавеце іх — 265, прытым што ўвогуле тут пражывае 1738 чалавек. У мясцовую школу ходзіць зараз 137 вучняў, і гэтая колькасць трымаецца стабільна, пацвярджае дырэктар установы Вадзім Крэк:

— Калісьці ў сельсавеце было чатыры школы, цяпер засталася адна. Аднак дзяцей з навакольных вёсак падвозім на заняткі на школьным аўтобусе. І дзеці, і дарослыя ў нас маюць магчымасць займацца більярдам, футболам, валейболам, баскетболам. Ёсць свая трэнажорная зала. У той жа час самі імкнёмся дапамагаць сельсавету. Догляд брацкага пахавання на мясцовых могілках — пастаянны клопат нашых школьнікаў. Вядома, усе лінейкі, літмантажы праводзім разам.

У бібліятэку, дзе мы гутарым з кіраўніцтвам школы, на перапынку забягаюць вучні. Для мяне — падстава пацікавіцца, як ім жывецца ў сваёй вёсцы. Дзіма Канапля прыязджае штодзень з вёскі Шалыпы. Кажа, аўтобус не спазняецца ніколі, а вучыцца падабаецца, таму што настаўнікі добрыя. Сям'я Каці Булаўкі пераехала ў Дудзічы з Калінкавіч, пабудавалі дом. Дзяўчынка кажа, што тут ім лепш, таму што ёсць свая гаспадарка. Карыне Змушцы падабаецца вучыцца іграць на фартэпіяна.

Урокі ў першым класе вядзе настаўніца Святлана БОБР.

Заглядваем у першы клас, дзе настаўніца Святлана Бобр вядзе заняткі... на дыване. Малыя слухаюць уважліва. Размова ідзе пра радзіму, значыць, і пра вёску, дзе яны жывуць. Дудзічам налета споўніцца 500. Круглая лічба прымушае не толькі падрабязна вывучаць гісторыю. Гэта ж асаблівая адказнасць, якую дзеці набываюць, калі побач ёсць станоўчы прыклад.

— У вёсцы людзі прывыклі рабіць усё сваімі рукамі, — разважае старшыня сельскага Савета Іна Змушка. — І таму цэняць тое, што для іх зрабілі. Матэрыяльная база ў нас значна ўмацавалася, у выніку палепшыліся і ўмовы жыцця людзей. Таму вельмі многія тут затрымаліся. Прыязджаюць і селяцца сем'ямі з горада. Многія працуюць у Калінкавічах. Многія — у мясцовай гаспадарцы КСУП «Дудзічы-Агра». Тыя, хто вывучыўся, дадому вяртаюцца. Больш за палову спецыялістаў — мясцовыя.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
iost@zviazda.by

Каментарый:

Дзмітрый ПЕТРАЖЫЦКІ, старшыня камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама:

— За перыяд рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі з 2005 па 2015 год на Гомельшчыне ў сельскай мясцовасці працаўладкаваны на пастаянную працу 22,5 тысячы беспрацоўных. Для паляпшэння жыллёвых умоў сельскіх жыхароў і залучэння маладых спецыялістаў адрамантавана 13,5 тыс. квадратных метраў жыллёвага фонду і ўведзена ў эксплуатацыю 5372 жылыя дамы (кватэры) у сельскагаспадарчых арганізацыях вобласці.

У сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі пабудавана каля 400 кіламетраў размеркавальных газаправодаў. Пераведзена на выкарыстанне прыроднага газу і газіфікавана больш 14,5 тыс. кватэр і жылых дамоў у аграгарадках і сельскіх населеных пунктах. Выкананы комплекс мерапрыемстваў па паляпшэнні матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў дашкольнай і школьнай адукацыі, медыцынскага, бытавога, гандлёвага і культурнага абслугоўвання сельскіх жыхароў, аб'ектаў фізічнай культуры і спорту. У тым ліку ўведзена ў эксплуатацыю 26 аб'ектаў турыстычнай індустрыі ў рэгіёнах, створана 350 аграсядзіб.

Сёлета раённымі выканаўчымі камітэтамі сумесна з галіновымі арганізацыямі распрацаваны і зацверджаны комплекс мер, накіраваных на павышэнне ўзроўню добраўпарадкаванасці аграгарадкоў на 2017—2020 гады. Фінансаванне забяспечваецца за кошт сродкаў бюджэту і пазабюджэтных крыніц, якія знаходзяцца ў распараджэнні адпаведных органаў кіравання і арганізацый, сродкаў, што выдаткоўваюцца па чарнобыльскіх праграмах, уласных сродкаў прадпрыемстваў і іншых.

У пасёлку Уза многа жыхароў з Брагінскага раёна, адселеных пасля Чарнобыльскага выбуху. Людзі з'язджалі далей ад небяспекі, здымаліся сем'ямі разам з дзецьмі і шукалі прытулак у новых мясцінах. Бацькі Галіны Сотнікавай таксама былі перасяленцамі. Прыехалі ў Буда-Кашалёўскі раён, узялі крэдыт і пачалі адбудоўвацца.

УСЁ Ў ПАРАДКУ

ПРЫБЯРЫ СВАЮ ПРАСТОРУ

Каля дома Галіны і Вячаслава СОТНІКАВЫХ улетку збіралася ўся вуліца

З дзіцячых успамінаў жанчына можа прыгадаць пустыр, дзе дзятва любіла паганяць мячык. Мясціны былі зусім немаляўнічыя: поле са стагамі ды звалка. Гэта цяпер спецыяльны трактар забірае смецце ледзь не ад самага дома, а раней такога не было, таму нярэдка вецер заносіў непрыемныя «сюрпрызы» проста на ўчастак.

— Звалку мы з мамай разбіралі разам, — успамінае Галіна Аляксееўна. — Яна і прапанавала зрабіць тут дзіцячую пляцоўку. Потым сама прыдумвала забаўкі для дзяцей. Мне з мужам усё гэта дасталася ў спадчыну, але таксама стараемся дадаваць штогод нешта новае.

Муж Галіны Вячаслаў служыць у МНС, энтузіязм жонкі падтрымлівае, дапамагае з цяжкай работай. Сама гаспадыня працуе на РУП Беларуснафта «Асобіна». Сужэнцы гадуюць чацвярых дзяцей. Вясною і дарослыя, і малыя выходзяць рыхтаваць дзіцячую пляцоўку для лета. Бацькі рамантуюць і ўстанаўліваюць атракцыёны, дзеці аднаўляюць фарбы на малюнках казачных герояў. Цэлае лета потым гэты лапік зямлі зелянее і радуе погляд кветкамі, а пагуляць да Сотнікавых збіраецца дзятва з усёй вуліцы.

— Калі аднавяскоўцы дазналіся, што мы робім дзіцячую пляцоўку, таксама прыходзілі дапамагаць. Асабліва шматдзетныя сем'і, якіх тут многа, так што адносіны з суседзямі ўсталяваліся даволі цесныя, — расказвае Галіна. — Дапамагалі цалкам добраахвотна, мы ніякіх умоў не ставілі.

У кожнага атракцыёна свая гісторыя. Некаторыя «доўгажыхары» стаяць тут без нечага дзесяць гадоў, іх прыдумала і зрабіла мама Галіны, Валянціна Іванаўна. Старыя вучнёўскія крэслы Галіне аддалі ў мясцовай школе. Потым муж прыварыў іх да рамы, і атрымалася карусель. Знайшлі сваё месца на пляцоўцы і драўляная альтанка, і арэлі, якія аддала суседка. Пры гэтым у сельвыканкама Галіна просіць хіба толькі фарбы — падправіць колеры ў персанажаў пляцоўкі.

— Даглядаем месца ў асноўным самі, сям'ёй. Але калі ў аднавяскоўцаў ёсць свабодныя рукі і жаданне дапамагчы, то хто ж стане адмаўляцца? Вось суседзі пасадзілі бярозкі, а мы з другога боку высадзілі абрыкосавыя дрэўцы, — тлумачыць Галіна. — Малыя аблюбавалі пясочніцу і горку, больш дарослыя з задавальненнем гуляюць у мяч — мы спецыяльна зладзілі валейбольную пляцоўку: пракапалі раўчукі-разметку, паставілі слупы, на якія летам нацягваем сетку. Падлеткам падабаецца альтанка далей ад дарогі. Ёсць магчымасць бавіць час тут і дарослым — бліжэй да поля пастаўлены мангал, выкладзена вогнішча.

Фота Рамана ВЕЖНАЎЦА.

Амаль штогод на пляцоўцы з'яўляецца новы атракцыён — вось і цяпер Галіна падгадвае месца для чарговых арэляў. Такая «грамадская нагрузка» яе зусім не напружвае.

— Мне падабаецца тое, што я раблю. Напэўна, ад маці перадалася цяга ствараць нешта прыгожае, прыбіраць прастору, у якой жыву.

Рагнеда ЮРГЕЛЬ. *yurgel@zviazda.by*
Мінск — Буда-Кашалёва — Мінск.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ СОБСТВЕННОСТИ СП «ВЕСТАВТО» ОАО

Наименование объекта	Начальная цена продажи, руб. без НДС	Размер задатка, руб.
ЛОТ №1: объект недвижимости 1: капитальное строение (инв. №100/С-44296) — санузлы, пл. 180,0 м², расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Коммерческая, 17И. **Объект недвижимости 2:** капитальное строение (инв. №100/С-84875) — навес таможенного досмотра, пл. 514,7 м², расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Коммерческая, 17И/1. Объекты расположены на земельном участке пл. 0,5915 га с кадастровым номером 140100000001029935	**77 170,00**	**2 496,00**

Организатор торгов	РУП «Институт недвижимости и оценки» Брестский филиал
Срок заключения договора купли-продажи	не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Условия оплаты	оплата производится в соответствии с заключенным договором купли-продажи
Условия продажи	без условий
Номер р/с для перечисления задатка	BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция №100 по Брестской области, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245
Аукцион состоится 23 октября 2017 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10 – 325 Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»	
Перечень документов для участия в аукционных торгах и иную информацию можно узнать по телефонам: (0162) 20-92-13; 21-88-81	
Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений — 23 октября 2017 г. до 10.00	

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении конкурса

